ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 113 (4365)
СУБОТА, 21 мая 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

## СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак — бальшавіцкі разгон.
Зьм. ПАВАРОТНЫ — Аўто разьвівае ход. (2-я стар.).
Е. БУТОМАЎ і З. ЛЕВІН — Харчовая прамысловасьць у другой пяцігодцы. (3-я стар.).
УЗНАГАРОДА ОРДЭНАМ ЛЕНІНА СТАЛІНГРАДЗКАГА ТРАКТАРНАГА ЗАВОДУ І РАДУ РАБОТНІКАЎ ГЭТАГА ЗАВОДУ — Пастанова прэзыдыуму ЦВК СССР. (1-я стар.).
Стралковаму паходу камсамолу — бальшавіцкія тэмпы. (2-я стар.).
Перабудова партыйна-масавай работы ў калгасах — асноўная умова пасьпяховай барацьбы за рэалізацыю пастаноў ЦК і СНК. (2-я стар.).
Рацыянальна скарыстаць кожны трактар, максымальна эканоміць гаручае. (1-я стар.).
Ператварыць конкурс у масавае спаборніцтва ўсіх водпікаў (2 стар.).
Капітальнае будаўніцтва прамысловасьці на поўны ход. (3-я стар.).
Работу школ на ўзровень задач камуністычнага выхаваньня. (3-я стар.).
Шырокія пляны Японіі ў Манчжурыі. (4-я стар.).

# Падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак — бальшавіцкі разгон

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя сваёй рэзалюцыі па дакладу тав. Арджанікідзэ канстатавала, што першай прычынай недавыкананьня пляну 1931 году зьяўлялася **«Дрэнная работа транспарту ў першым квартале 1931 г., якая затармазіла шпаркае разьвіцьцё прамысловасьці».**

Чыгуначны транспарт за апошні час дабіўся значнага паляпшэньня сваёй работы. Ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб ліквідацыі абязьлічкі на паравозе, рэалізацыя 6 умоў тав. Сталіна, першы і другі ўсебеларускі і ўсесаюзны конкурсы спараных брыгад прасунулі чыгуначны транспарт наперад. Красавік даў новыя перамогі на фронце аздараўленьня транспарту. Нормы сярэднясутачнага прабегу таварнага паравоза ў красавіку перавыкананы па ўсіх чыгуначных раёнах Беларусі, апрача Віцебскага. Параўнальна з папярэднімі месяцамі ёсьць павялічэньне і сярэднясутачнага прабегу таварнага вагону. Значна зьнізіўся лік хворых паравозаў. У **Гомельскім** раёне на 2,3 проц. ніжэй заданай нормы, у Аршанскім раёне—на 2,01 проц. Толькі ў **Віцебскім** раёне лік хворых паравозаў вышэй нормы амаль на 2 проц., хаця супроць сакавіка і па гэтым раёне ёсьць паніжэньне на 2 проц. Значна скараціўся лік зрываў спаранай.

Гэтыя посьпехі заваяваны ў выніку бальшавіцкай мабілізацыі мас на рэалізацыю дырэктыў партыі, у выніку шырока-разгорнутай масавай работы вакол конкурсаў, рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, павышэньня якасьці сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Апартуністычныя разважаньні аб немагчымасьці выканаць план, аб нерэальнасьці яго атрымалі яшчэ адзін зьнішчальны правал.

Адзначаючы станоўчыя вынікі праведзенага конкурсу, трэба сказаць, што замацаваньне посьпехаў, якія былі заваяваны імі, ідзе не на ўсіх раёнах адналькава. Добрыя прыклады паказвае Віцебскі раён, які за апошні час у выніку перабудовы работы сыстэматычна пасоўваецца наперад, выходзячы з глыбокага тылу, у якім быў на працягу доўгага часу. Віцебскі раён, у першую дэкаду мая, зрабіў яшчэ адзін крок наперад.

Перад віцебскай чыгуначнай партыйнай і прафсаюзнай арганізацыямі, перад гаспадарнікамі стаіць задача ня спыняцца на дасягнутым, а яшчэ з большай упартасьцю змагацца за поўнае выкананьне транспфінпляну па ўсіх паказальніках, за ўдарную падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак.

Трэба завастрыць увагу ўсёй пралетарскай грамадзкасьці на фактах адваротнага характару, калі па некаторых раёнах пасьля сканчэньня конкурсу падзьмула «халадком», аслабла барацьба за трансфінплян. Яркім прыкладам гэтага можа служыць Аршанскі раён, які ў першую дэкаду мая здаў тэмпы амаль па ўсіх паказальніках. Прабег таварнага паравоза зьнізіўся да 89 проц. нормы, таварнага вагона — да 78,9 проц., хворых вагонаў вышэй нормы амаль на 4 проц. Па прабегу таварнага вагона, звароту вагона ў суткі, здарэньнях ёсьць пагоршаньне і ў рабоце **Гомельскага** раёну.

Задача заключаецца ў тым, каб побач з замацаваньнем і паглыбленьнем посьпехаў конкурсаў, побач з далейшым павышэньнем тэмпаў работы распачаць баявую падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак.

Стрыжневым пытаньнем у падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак зьяўляецца **поўнае аздараўленьне паравознага і вагоннага парку.** Асеньня-зімовы паток грузаў патрабуе максымальна-эфэктыўнага скарыстаньня паравоза і вагона. Спэцрамонт паравозаў, аздараўленчая кампанія вагоннага парку—важнейшыя гаспадарча-палітычныя мерапрыемствы, накіраваныя на вырашэньне гэтай задачы. Адсюль тая ўвага, якая патрабуецца з боку мясцовых чыгуначных і тэрыторыяльных арганізацый да гэтай першачарговай работы. Асабліва вялікая адказнасьць за падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак кладзецца на рамонтныя заводы (імя Ланцуцкага, «Полымя рэвалюцыі»), на дэпо. У іх павінна быць пастаўлена работа сапраўды па-бальшавіцку. Пастанова журы 2-га ўсебеларускага конкурсу спараных брыгад, якая сёньня друкуецца ў «Зьвязьдзе» аб **працягу конкурсу на лепшае дэпо, лепшага начальніка, майстра, мацёра, рамонтную брыгаду** і г. д. павінна садзейнічаць чыгуначным арганізацыям у справе разгортваньня сапраўды ўдарнай работы па аздараўленьні паравознага парку. На аснове шырокай мабілізацыі рабочых мас, уцягненьня ў спаборніцтва ўсіх рамонтных брыгад, усіх рабочых і ІТР цягі, усіх чыгуначнікаў даб'ецца ўзброенай сустрэчы асеньня-зімовых перавозак.

Загад тав. Андрэева патрабуе **давядзеньня карыснай работы паравозаў да 11 гадзін у суткі і вагонаў да 8 з паловаю гадз.,** далейшай барацьбы за зьніжэньне ліку хворых паравозаў і вагонаў і павялічэньня іх сярэднясутачнага прабегу. Асабліва адстаюць чыгуначныя раёны БССР па выкананьні норм карыснай работы паравозаў і вагонаў.

У справе павышэньня эфэктыўнасьці работы, зьніжэньня процанту хворых паравозаў і вагонаў, важнейшае значэньне мае якасьць рамонту, барацьба супроць паўторнасьці.

Задача партарганізацыі — шырэй разгарнуць масава-палітычную работу вакол загаду тав. Андрэева, узьняць хвалю сацыялістычнага спаборніцтва на лепшую рэалізацыю яго, на лепшую падрыхтоўку да паравозак асеньня-зімовага перыяду.

Вялікія задачы пастаўлены загадам перад **апаратам руху.** Тут перабудова, ліквідацыя абязьлічкі фактычна толькі яшчэ пачалася. Гэту работу трэба завяршыць. Да 1 верасьня павінны быць даведзены да нізоў дэталізаваныя вымяральнікі эксплёатацыі. Неабходна рашуча ўпарадкаваць і разгарнуць справу маршрутызацыі і спэцыялізацыі цягнікоў.

Рацыянальнае скарыстаньне капіталаўкладаньняў у шляхавую гаспадарку, паляпшэньне профілю шляху, поўная ліквідацыя запушчанасьці водаснабжэньня—важнейшыя элемэнты падрыхтоўчай работы.

Вялікай увагі партыйнай, прафсаюзнай арганізацыі, гаспадарнікаў патрабуе **пытаньне далейшага паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў чыгуначнікаў і культурна-масавага абслугоўваньня іх. Гэта адна з важнейшых задач.** Пашырэньне сеткі сталовых, магазынаў, разгортваньне гародняй гаспадаркі, трусагадоўлі, птушкагадоўлі, дробнай жывёлагадоўлі—вось тыя асноўныя шляхі, па якіх вызначана загадам тав. Андрэева работа па паляпшэньні рабочага снабжэньня. Перад транспартнай капэрацыяй тут стаіць вялізарныя задачы. Яна трымае экзамэн сваёй перабудовы перад адказнейшым пэрыядам надыходзячых асеньня-зімовых перавозак.

Ліквідацыя ўраўнілаўкі, правільная арганізацыя сыстэмы зарплаты, поўная рэалізацыя 6 умоў тав. Сталіна, правільная расстаноўка рабочай сілы, павышэньне прадукцыйнасьці працы, канкрэтызацыя кіраўніцтва—у гэтым зарука перамогі.

Задача заключаецца ў тым, каб не адкладваючы, зараз-жа разгарнуць бальшавіцкую, ударную падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак, рашуча перамагаючы перашкоды апартуністаў, чыноўнікаў і бюракратаў.

# РАЦЫЯНАЛЬНА СКАРЫСТАЦЬ КОЖНЫ ТРАКТАР, МАКСЫМАЛЬНА ЭКАНОМІЦЬ ГАРУЧАЕ

## Лёзьнянская, Шклоўская і Віцебская ільнаводчыя МТС паказваюць узор безадказных адносін да пасеўнай кампаніі

### „Аб'ектыўныя" прычыны і факты

ЛЁЗНА. Дырэкцыя Лёзьнянскай МТС упарта даводзіць, што глеба вільготная і вязкая, трактары ня могуць араць, не гаворачы ўжо аб сяўбе. Бачыце, па іх думцы, сёлета сваясаблівая вясна: зямля адтаяла толькі зьверху, у глыбіні — лёд. Адсюль робяць вывады, [illegible] разгортваньнем сяўбы можна [illegible]ць.

8-9 мая прайшлі вялікія дажджы. Работнікі МТС парашылі зноў пачакаць тыдзень. У выніку плян сяўбы на 15 мая выканан усяго на 2,6 проц.

Такія «дажджавыя» настроі пануюць ня толькі ў кіраўніцтве МТС, але і ў старшынь раду калгасаў, пасобных работнікаў раённых арганізацый.

Але не ва ўсіх такія настроі. Возьмем, напрыклад, калгас «Апора саветаў». Тут сяўба разгортваецца бальшавіцкімі тэмпамі. Старшыня калгасу тав. **Заічанка** абяцае, ня гледзячы ні на якія прычыны, скончыць сяўбу датэрмінова на 10 дзён і тым самым заваяваць пяршынства ва ўсебеларускім конкурсе. Ужо засеяна 35 га ранніх культур. Пасевы ільну, ячменю і вікі далі добрыя ўсходы. Гэтыя факты абвяргаюць «тэорыі» некаторых раённых кіраўнікоў (загадчыка райза тав. Наймана) аб тым, што пасевы, зробленыя да дажджу, могуць загінуць, вымые дожджыкам.

Прыклад калгасу «Апора саветаў» блішчыць абвяргае і думку кіраўнікоў МТС (у прыватнасьці, дырэктара Селіванава) аб тым, што трактары вязнуць.

12 мая трактарыст тав. **Гобалаў** з посьпехам працаваў па дыскаваньні глебы пад ячмень. У гэты-ж дзень увесь трактарны атрад у калгасе «Апора саветаў» выйшаў на ворыва канюшынішча і цаліны. Ні адзін трактар не завяз. Вялізарная дапамога аказана коням, якія пераключаны на лягчэйшыя работы. У гэты дзень сеялася шпаніца.

На запытаньне трактарысту тав. Гобалаву—«Ну як, ня вязьне машына пасьля дажджу?—ён адказвае:

— А ведаеце, неяк глеба пацьвярдзела.

Глеба можа і не пацьвярдзела, але даўно пара разгортваць работу трактарнага парку ва ўсю шырыню. Час ня церпіць. Нельга дапусьціць зрыў сяўбы, якая ў Лёзьнянскім раёне ўжо пад пагрозай.

**А. Мікуцкі.**

### Шклоўская МТС ганебна адстае

**ШКЛОЎ. (Наш кар.).**

Шклоўскай МТС трэба засеяць у гэтым годзе 10.000 га яравога кліну. З іх 3.004 га тэхкультур.

Сяўба павінна быць скончана да 25 мая. Абслугоўвае МТС 60, у большасьці буйных ільнаводчых калгасаў (калгас «Барацьба» — 690 га пасеву ільну, калгас імя Карла Маркса — 100 з лішнім га і інш.).

Дырэктар МТС тав. Клешчоў даказвае, што на шыпках усё спакойна, усе ўмовы для пасьпяховага выкананьня пастаўленых задач перад МТС у наяўнасьці. «Апарат для абслугоўваньня МТС падобран поўнасьцю: 5 загадчыкаў вытворчых вучасткаў, 5 аграномаў, 3 мэханікі, 8 калёнаважатых. Трактары адрамантаваны поўнасьцю, запасных частак для іх хопіць, гаручым і змазачным МТС забясьпечана поўнасьцю».

Здавалася-б, паводле слоў дырэктара, сапраўды справа стаіць добра і ня трэба турбавацца аб тым, што МТС ня справіцца з пастаўленай перад ёй задачай у часе веснавой сяўбы.

Аднак, на справе мы бачым зусім іншае. На 15 мая плян сяўбы выкапан толькі на 1,4 проц.

Дырэкцыя МТС такое ганебнае адставаньне тлумачыць тым, што «яшчэ гразка працаваць». Відаць, чакаюць па куль падсохне ня толькі ў роўных мясцох, але і ў лагчынах.

Асноўная-ж прычына ня ў тым, што «гразка», а ў тым, што дырэкцыя МТС дрэнна вывучыла свае вытворчыя вучасткі. Яна ня ведае, на якім вучастку і ў якім месцы можна ў першую чаргу прыступаць да працы.

Яшчэ горш стаіць справа з рамонтам трактараў. Два трактары, не адышоўшы нават 80 мэтраў ад парку, сапсаваліся. Трактары першай калёны № 2, 5 і 6, не працаваўшы на полі, патрабавалі рамонту. У 6-й калёне таксама аказаліся няспраўнымі 2 трактары (не бяруць на другую скорасьць і прасачваецца скрозь сьвечы масла), а трактар за № 17334 аказаўся зусім непрыгодным да працы і калёнамі ня прынят. Ні адна калёна не забясьпечана поўнасьцю неабходнымі прыладамі (інструмант, ключы, вёдры і г. д.).

### Зямля мокне ад газы

**ВІЦЕБСК (Наш кар.).**

Першыя дні сяўбы па некаторых калгасах дзейнасьці МТС паказалі вельмі нізкую прадукцыйнасьць трактарнага парку і вялікі перарасход гаручага.

Да гэтага часу калгасы **імя Чарвякова, «Перамога», «Чырвоная армія», «Зьвязда»** ня скончылі ворыва.

Аб працы трактарнага парку МТС досыць прывесьці наступныя факты. Так, у калгасе **«Чырвоная армія»** за **11 дзён** адным трактарам узарана **3,27 га.** Гаручага расходавана **232 кгр.** замест **100 кгр.**

Трактарам, які знаходзіцца ў калгасе **імя Чарвякова,** за **6 дзён** узарана **10.3 га.** Гаручага расходвана **334 кгр.** У калгасе **«Перамога»** адным трактарам за **4 дні** ўзарана **4 га,** гаручага патрачана замест **123 кгр.— 192.**

Такія-ж рэзультаты работы трактараў мы маем у калгасе **«Заілік»,** дзе за **15 дзён** двума трактарамі ўзарана **15,8 га,** а гаручага расходавана **звыш нормы 264 кгр.**

Зараз у МТС стаіць сапсаваных 2 трактары, якія яшчэ не адрамантаваны і не скарыстоўваюцца на палявых работах.

Ня гледзячы на такія ганебныя вынікі работы трактараў, перарасход гаручага, адміністрацыя МТС ня ўжывае практычных захадаў, каб ліквідаваць гэтыя ганебныя зьявішчы і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

Трактарацэнтр павінен неадкладна пацікавіцца работай Віцебскай МТС і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці за злачыннае скарыстаньне трактарнага парку.

## У адказ на пастановы ЦК і СНК перадавыя калгасы і саўгасы датэрмінова завяршаюць сяўбу

### Працуюць ударнымі тэмпамі

ЧЭРВЕНЬ. (Па тэлефону).

Па раёне шырока разгорнута работа па папулярызацыі апошніх пастаноў партыі і ўраду аб збожжа і жывёлазагатоўках і с.-г. падатку. Перадавыя калгасы і саўгасы разгарнулі ўдарную работу па датэрміновым сканчэньні сяўбы.

Так, саўгас **«Рудня-Астравітая»** ўжо скопчыў сяўбу бульбы, гароху і аўса. У бліжэйшыя дні канчаецца пасеў турнэпсу і грэчкі. Вольная рабочая і цягавая сіла пераключана на дапамогу падшэфнаму калгасу **«Чырвоны камунар»,** дзе ўжо два дні працавалі два трактары і адзін дзень брыгада з 25 чал. рабочых. У выніку гэтай дапамогі і разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва калгас «Чырвоны камунар» 19 мая ў асноўным скончыў сяўбу. Засталося пасеяць 2 гэкт. грэчкі і 2,5 гэкт. сіласных культур.

Саўгас **«Маладая гвардыя»** на 20 мая скончыў пасеў аўса, лубіну, гароху. Ударнымі тэмпамі праходзіць сяўба бульбы і культурных траў. Праз два дні саўгас закончыць сяўбу.

***

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону).

Калгас **«Чырвоны баец»,** Карсакоўскага сельсавету, 19 мая скончыў сяўбу яравых. Аўса засеяна 27 гэкт., плян перавыкананы на 125 проц.; ячменю засеяна замест патрэбных, паводле пляну, 10 гэкт.—16 гэкт., або 160 проц. пляну; шпаніцы—12 гэкт. —100 проц. пляну; бульбы—65 гэкт. —100 проц. пляну; лубіну па насеньне—4 гэкт.—100 проц. пляну. Звыш пляну засеяна 7 гэкт. позьняга лубіну. Зараз калгас заканчвае сяўбу гародніны.

## Чырвоны сьпіс кандыдатаў на прэміяваньне

**СЛУЦАК. (Па тэлеграфу).**

**Калгас імя К. Лібкнэхта, Амговіцкага сельсавету, 19 мая скончыў сяўбу яравых. Засеяна 160 гэкт.**

***

**КОЙДАНАВА. (Па тэлеграфу).**

**Саўгас «Негарэлае» 19 мая скончыў сяўбу яравых культур датэрмінова, на 7 дзён раней тэрміну. Засеяна 531 гэкт. яравога кліну, з іх аўса — 157 гэкт., ячменю — 27 гэкт., бульбы — 132,25 гэкт., вікі — 150 гэкт., з якой на насеньне 35 гэкт., сэрадэлы на насеньне — 3 гэкт., морквы і буракоў — 2 гэкт., турнэпсу — 3 гэкт., гародніны — 4 гэкт., падсеяна канюшыны 102 гэкт. Рабочы калектыў і адміністрацыйна - тэхнічны пэрсанал бяруць на сябе абавязак аказаць дапамогу саўгасу імя Сталіна і калгасу «Кастрычнік» па хутчэйшым сканчэньні веснавой сяўбы.**

***

**ХОЙНІКІ. (Па тэлеграфу).**

**Саўгас «Стрэлічава» 15 мая скончыў сяўбу яравых збожжавых. Засеяна аўса 95,5 гэкт., вікі на насеньне — 28 гэкт., вікі на сена — 112 гэкт., сіласных культур — 12 гэкт., насеньнікаў-кораньплодаў — 3 гэкт., кораньплодаў — 10 гэкт. Засаджана саду 12 гэкт.**

***

**ГЛУСК. (Па тэлеграфу).**

**Саўгас «Заваліочыцы» напярэдадні выкананьня пляну веснавой сяўбы. На 15 мая засеяна аўса 165 гэкт. (100 проц. пляну), вікі на насеньне — 48 гэкт. (100 проц. пляну), вікі кармовай — 190 гэкт. (100 проц. пляну), кораньплодаў — 3 гэкт. (100 проц.), бульбы — 49 гэкт. (20 проц.). Засеяна 25 гэкт. сіласных культур.**

***

**ЧЭРВЕНЬ. (Сьпешнай поштай).**

**Саўгас «Рудня Астравітая» 16 мая поўнасьцю скончыў сяўбу яравых. Засеяна 29 гэкт. аўса, 27 гэкт. бульбы, 19 гэкт. вікі, 27 гэкт. сэрадэлы, 27 гэкт. лугавых траў, 14 гэкт. бабовых, морквы—10,3 гэкт., турнэпсу —12,5 гэкт., гароху — 14 гэкт., або 142 проц. пляну, лубіну —19 гэкт. і іншых культур — 22 гэкт. Падсеяна цімафеўкі 20 гэкт.**

## Сакратар ЦК КП(б)Б тав. Жаброўскі ў Плешчаніцкім раёне

**ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Па тэлефону).**

**12 мая ў Плешчаніцы прыбыў сакратар ЦК КП(б)Б тав. ЖАБРОЎСКІ. Разам з ім прыехала брыгада пісьменнікаў у складзе т. т. АЛЕКСАНДРОВІЧА і БАРАШКІ.**

**Тав. Жаброўскі азнаёміўся з ходам сяўбы ў раёне і наведаў калгас «Чырвоны штандар», дзе выступіў з прамовай аб значэньні апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжа і жывёлазагатоўках. На агульным сходзе калгасьнікаў «Чырвонага штандару» тав. Жаброўскі выбран ганаровым членам калгасу. Тав. Жаброўскі таксама наведаў калгас ІМЯ ВАЛАДАРСКАГА.**

**14 мая брыгада правяла работу па праверцы ходу веснавой сяўбы ў калгасе «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», у вёсцы Камень.**

**Тав. Жаброўскі правёў нараду з партактывам Плешчаніцкага раёну, дзе ўказаў, што Плешчаніцкі раён зацягвае сяўбу. Раньнія тэрміны сяўбы прапушчаны. На 12 мая па раёне засеяна 10 проц. яравога кліну.**

**На нарадзе выявілася, што райкалгасгасаюз, МТС не забясьпечылі своячасовага абмену і перакідкі насеньня паміж калгасамі. Дастаўка з Барысава насеньня сланэчніку, прызначанага калгасам раёну, праведзена несваячасова і заняла 15 дзён. МТС мае ўсяго шасьцідзённы запас нафты. Штучнае ўгнаеньне, прызначанае для калгасаў раёну, яшчэ ня вывезена і знаходзіцца ў Барысаве ў колькасьці 4,5 вагонаў.**

**Нарада прызнала неабходным забясьпечыць рашучы пералом у ходзе веснавой сяўбы. Прапанавана раённым арганізацыям у трохдзённы тэрмін арганізаваць дастаўку ўгнаеньня Плешчаніцкаму раёну.**

**Прыехаўшыя пісьменьнікі т. т. АЛЕКСАНДРОВІЧ і БАРАШКА наладзілі літаратурныя вечары, прысьвечаныя веснавой сяўбе, для калгасьнікаў, вучняў вясковых школ і пагранічнікаў.**

## Калгасьнікі і аднаасобнікі арганізоўваюць працоўную ўзаемадапамогу

ЕЛЬСК. (Наш спэцкор).

Калгас «Пралетары», Мялешкаўская га сельсавету, першым у раёне ідзе па правядзеньні трэцяй бальшавіцкай сяўбы. Да 15 мая ўжо скончана сяўба аўса, ячменю, ільну, пшаніцы і вікі. Плян пасеву канапель выканан на 60 проц., бульбы—па 20 проц. і кораньплодаў—37 проц.

Посьпех сяўбы забясьпечан добра арганізаванай працай. Паміж паляводчымі брыгадамі шырока разгорнута сацспаборніцтва. Кожны дзень пасьля работы брыгадзіры дакладваюць праўленьню калгасу аб выкананьні сваіх дзённых вытворчых заданьняў. У канцылярыі калгасу вывешан агульны плян трэцяй бальшавіцкай сяўбы з аднакай штодзённага выкананьня яго. Кожны калгасьнік у любы момант можа даведацца, як ідзе выкананьне пляну сяўбы.

Нарада брыгадзіраў і ўдарнікаў-калгасьнікаў у адказ на пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжа-загатоўках, жывёлазагатоўках і новым законе аб с.-г. падатку ўзяла на сябе абавязак падрабязна распрацаваць гэтыя пастановы ў кожнай брыгадзе, давесьці іх да кожнага калгасьніка, беднякa і серадняка—аднаасобніка. 15 мая ў калгасе праводзіўся нядзельнік па сканчэньні засеву яравых культур. Удзельнікі нарады абавязаліся ўзяць на сацыялістычны буксір аднаасобны сэктар вёс. Мялешкавічы і аказаць ім дапамогу ў хутчэйшым сканчэньні засеву ўсяго яравога кліну.

**Б.**

## ВСФК і ЦК ЛКСМБ арганізуюць эстафэту „За ўраджай"

Вышэйшы Савет фізычнай культуры БССР разам з ЦК ЛКСМБ з 15 мая арганізавалі ўсебеларускую аўта-мота-вэлёэстафэту «За ўраджай».

Намечаны 4 маршуты эстафэты ў залежнасьці ад спэцыялізацыі раёнаў: ільнамалочны, жывёлагадоўча-бульбяны, жывёлагадоўча-канапляводчы і садова-гародны маршрут.

Задача эстафэты—давядзеньне пастаноў партыі і ўраду да мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў, дапамога калгасам, саўгасам і МТС ажыцьцявіць на справе дырэктывы партыі аб узьняцьці ўраджайнасьці на сацыялістычных палёх, своячасова і з посьпехам скончыць веснавую сяўбу, мабілізаваць усе фізкультурныя і камсамольскія арганізацыі на выкананьне плянаў трэцяй бальшавіцкай сяўбы.

Эстафэта пачалася 15 мая і канчаецца 25 мая.

**Шабашоў.**

# Узнагарода ордэнам Леніна Сталінградзкага трактарнага заводу і раду работнікаў гэтага заводу

## *Пастанова прэзыдыуму ЦВК Саюзу ССР*

МАСКВА. Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту СССР пастанаўляе:

I.

За аўладаньне праектнай магутнасьцю, перавыкананьне вытворчай праграмы і дасягненьне 150 трактараў у дзень, зменст праектнай магутнасьці 144 трактары ў дзень — узнагародзіць **Сталінградзкі трактарны завод імя Ф. Э. Дзяржынскага ордэнам Леніна.**

II.

За асабліва выдатныя заслугі кіраўнікоў і спэцыялістаў работнікаў Сталінградзкага трактарнага заводу па аўладаньні праектнай магутнасьцю заводу і перавыкананьні вытворчай праграмы ўзнагародзіць ордэнам Леніна наступных рабочых і кіраўнікоў з адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу заводу:

1. **Пудалава А. Д.** — дырэктара заводу — за цвёрдую арганізацыю вытворчасьці і поспехі, бязупынное кіраўніцтва барацьбой калектыву заводу за аўладаньне праектнай магутнасьцю заводу і перавыкананьне вытворчай яго праграмы.

2. **Трэгубенка К. Е.** — сакратара парткому — за арганізацыю рабочых мас вакол пытаньняў вытворчасьці заводу і аўладаньне высокай тэхнікай.

3. **Вержынскага Ю. І.** — начальніка ліцейнага цэху — за ўмелае кіраўніцтва работай цэху, якое забясьпечыла дасягненьні заводу, удзым прадукцыйнасьці працы і скарачэньне браку ў вытворчасьці.

4. **Шэймана І. Б.** — начальніка кавальскага цэху — за посьпяховае кіраўніцтва работай цэху, якое забясьпечыне перавыкананьне вытворчай праграмы заводу.

5. **Гроса Л. І.** — начальніка інструментальнага цэху — за выдатнае кіраўніцтва работай цэху, якое поўнасьцю забясьпечыла снабжэньне заводу інструментамі, што раней прывозіліся з-за граніцы.

6. **Чарнко Д. В.** — памоснька начальніка мэханічна-зборачнага цэху— за выключную работу, якая забясьпечвае выкананьне цэхам усіх вытворчых заданьняў.

7. **Атрынскага Л. М.** — ударніка, начальніка аддзяленьня халодных штампаў, — за ўмелае асваеньне амэрыканскай тэхнікі ў вытворчасьці.

8. **Хонэй Д. Б.** — начальніка прыжымнага аддзелу, грамадзяніна ПАЗШ — за выключна каштоўную дапамогу на асваеньні заводам амэрыканскай тэхнікі.

9. **Дубініна Н. П.** — начальніка [illegible] аддзелу — за эканомію [illegible]

[illegible] і правільнае правядзеньне гаспадарчага разрахунку, што забясьпечыла перавыкананьне вытворчых плянаў.

10. **Муравенка А. Г.** — памочніка начальніка фармовачнага аддзелу — за ўмелую арганізацыю тэхнічнага навучаньня маладых рабочых.

11. **Пашанка І. Т.** — начальніка элм. аддзелу — за рацыяналізатарскія прапановы, якія далі вялікі эканамічны эфэкт, і за ўмелае навучаньне рабочых фармовачнай справе.

12. **Кузьвева П. С.** — ударніка, майстра інструментальнага цэху — за дуткае асваеньне вытворчай тэхнікі і ўзорную ўдарную работу.

13. **Левандоўскага А. М.** — старэйшага майстра вялікага канвэеру— за ўмелую арганізацыю канвэеру і садзейнасьць пазнаньню асваеньню рабочымі амэрыканскай тэхнікі.

14. **Фандзюшына Т. А.** — ударніка, рабочага кузьні — за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчай праграмы.

15. **Маскоўчанка П. П.** — ударніка, рабочага кузьні — за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчай праграмы.

16. **Кубасава І. Н.** — ударніка, рабочага кузьні — за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчай праграмы.

17. **Долатава Ф. А.** — ударніка рабочага кузьні — за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчай праграмы.

18. **Чэльшава К. Т.** — ударніка, рабочага ліцейнага цэху — за арганізацыю сацыялістычных мэтадаў работы на заводзе і за ўдарную работу ў якасьці брыгадзіра-фармоўшчыка.

19. **Калашнікава І. В.**—ударніка, рабочага ліцейнага цэху—за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчай праграмы.

20. **Богашава П. М.**—ударніка, рабочага мэханічна-зборачнага цэху— за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчай праграмы.

21. **Рабіновіча Я.** — ударніка, рабочага мэханічна-зборачнага цэху — за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчай праграмы.

22. **Вэбэра К. А.**—ударніка, рабочага інструментальнага цэху—за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчай праграмы.

23. **Макароўскага С. С.**—тэхнічнага дырэктара—за выдатную работу па арганізацыі і кіраўніцтве барацьбой заводу за асваеньне праектнай магутнасьці.

24. **Сатэля Э. К.**—тэхнічнага дырэктара—за выдатную работу, якая забясьпечыла асваеньне заводам праектнай магутнасьці.

25. **Меламеда І. О.**—начальніка мэханічна-зборачнага цэху — за ўмелае кіраўніцтва работай цэху, якое забясьпечыла дасягненьні заводу.

26. **Вальтара К. Ф.**—ударніка, былога начальніка мэханічна-зборачнага цэху—за энэргічную работу па арганізацыі цэху.

27. **Пяткоўскую**—ударніцу, памочніцу начальніка другога аддзяленьня —за выдатную ўдарную работу, якая спрыяла выкананьню аддзяленьнем вытворчай праграмы.

28. **Ураву П. Т.**—ударніцу — за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчай праграмы.

29. **Фідзіну К. Е.**—ударніцу — за сыстэматычнае перавыкананьне вытворчай праграмы.

III.

Газэту Сталінградзкага трактарнага заводу «Даеш трактор» за асабліва выдатныя заслугі ў арганізацыі грамадзкай садзейнасьці па аўладаньні магутнасьцю заводу і перавыкананьні ім вытворчай праграмы—узнагарадзіць ордэнам Леніна.

IV.

Занесьці на дошку гонару Сталінградзкага трактарнага заводу імя Ф. Э. Дзяржынскага наступных арганізатараў будаўніцтва заводу:

1. **Іванова В. І.**—начальніка будаўніцтва; 2. **Кагана П. С.**—галоўнага інжынэра заводу; 3. **Горскага А. К.**—інжынэра; 4. **Герасімава П. С.**—інжынэра; 5. **Ватуліна М. П.**—рабочага ўдарніка; 6. **Казлова Н. Т.**—рабочага ўдарніка; 7. **Цітава Т. І.** — рабочага ўдарніка; 8. **Сучкова М. І.**—арганізатара рабочых мас, сакратара парткому будаўніцтва; 9. **Бердзікага М. К.** — арганізатара ўдарных брыгад;

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
**М. КАЛІНІН.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
**А. ЕНУКІДЗЭ.**

**Заўвага:** За асабліва выдатныя заслугі перад Саюзам ССР, праяўленыя ў будаўніцтве Сталінградзкага трактарнага заводу, 8 жніўня 1931 г. былі ўзнагароджаны ордэнам Леніна работнікі гэтага заводу: 1) **Іваноў В. І.**—начальнік будаўніцтва; 2) **Каган П. С.**—галоўны інжынэр; 3) **Горскі А. К.**--інжынэр; 4) **Герасімаў П. Л.**—інжынэр; 5) **Ватулін М. П.**—рабочы; 6) **Казлоў Н. Т.** — рабочы; 7) **Цітаў Т. І.**—рабочы; 8) **Сучкоў М. І.**—сакратар парткому; 9) **Бердзікаў М. К.**— арганізатар ударных брыгад.

# Аб кантрактацыі ільну і канапель

## *Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК СССР*

Разгледзіўшы пытаньне аб выкананьні пастановы СПА ад 14 лютага 1932 году і Камісіі Выкананьня ад 19 красавіка 1932 году аб кантрактацыі ільну і канапель, Камісія Выкананьня **ўстанаўляе:**

1. Побач са своячасовым скончэньнем кантрактацыі ў Маскоўскай, Уральскай і Цэнтральна - Чорназёмнай абласьцях, Паўночным і Заходнім Сібірскіх краёх і Украінскай ССР, плян кантрактацыі ільну і канапель у Ленінградзкай, Заходняй і Івана-ўскай абласьцях і Сярэдня-Волскім краі ня выканан ва ўстаноўлены ўрадам тэрмін (1 мая 1932 г.).

2. Камісія Выкананьня асабліва адзначае зусім нездавальняючае правядзеньне кантрактацыі па Беларускай ССР (на 1 мая выканана па ільну-даўгунцу 62 проц. і канаплях — 47 проц.) і Ніжагародзкім краі (на ільну-даўгунцу — 71 проц. і канаплях — 60 проц.).

3. Ня гледзячы на папярэджаньне Камісіі Выкананьня ў радзе раёнаў па-ранейшаму мае месца фармальнае заключэньне дагавароў без абгаварэньня іх на сходзе калгасьнікаў і аднаасобнікаў, без растлумачэньня кантрактантам новых умоў і ільгот, устаноўленых пастановамі ўраду.

**Камісія Выкананьня пастанаўляе:**

1. **Прапанаваць СНК БССР і Ніжагародзкаму крайвыканкому** паведаміць Камісіі Выкананьня да 25 мая 1932 году аб выніках кантрактацыі.

2. **Прапанаваць тав. Трудову** (лепком), тав. **Батракавец** (Галоўленком), тав. **Батракову** (Галоўканапляводу) і тав. **Цёмкіну** (Трактарацэнтр) у месячны тэрмін праверыць афармленьне на мясцох дагавароў па кантрактацыі і давядзеньне да пасеўшчыкаў устаноўленых урадам ільгот.

3. Абавязаць тав. **Чарнова** (камітэт заготаваў пры СПА), тав. **Хлопляніна** (Цэнтрасаюз), тав. **Фушман** (НКЛёгпрам) паведаміць Камісію Выкананьня не пазьней 10 чэрвеня г. г. аб рэальным вы

ПАРТЫИНАЕ БУДАЎНІЦТВА

# Перабудова партыйна-масавай работы ў калгасах—

## АСНОЎНАЯ УМОВА ПАСЬПЯХОВАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАСТАНОЎ ЦК І СНК, ЗА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ УМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ, ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

### Увага нізавому партыйнаму зьвяну ў калгасах

Перабудова партыйнай работы калгасных ячэек, перанясеньне яе цэнтру дзяжару ў нізавое вытворчае зьвяно—асноўны сродак пасьпяховага змаганьня партыйных арганізацый за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за папярэньне сельска-гаспадарчай вытворчасьці, за пасьпяховае правядзеньне трэцяй бальшавіцкай сяўбы. Між тым, у радзе раёнаў асобныя парт'ячэйкі яўна недаацэньваюць перабудовы партыйнай работы, разгортваньня палітычнага выхаваньня мас.

Падаю некалькі канкрэтных фактаў. Сакратар партыйнай ячэйкі калгасу «Маяк» тав. **Жаўрыт** заяўляе: «Пытаньне перабудовы партработы ўжо ўстарэла (?), гэтым пытаньнем няма часу займацца». Ня дзіўна, што ў пратаколах гэтай ячэйкі можна знайсьці такія запісы:

**«Слухалі:** аб рабоце з беднатой.

**Пастанавілі:** склікаць сходы беднаты, на якіх ставіць пытаньні палітычнага характару.

**Слухалі:** пастанову ЦК аб сярэдняй і пачатковай школе.

**Пастанавілі:** далучыцца да пастановы і весьці рашучую барацьбу са скажэньнямі ў ажыцьцяўленьні гэтай пастановы».

Гэта, як ня трэба лепш, характарызуе, што партыйная ячэйка калгасу «Маяк» не перабудавала сваёй работы, не ўзбагаціла яе зьместу новымі формамі. Да вырашэньня актуальнейшых пытаньняў ячэйка адносіцца фармальна.

Партыйная ячэйка калгасу **«Высачаны»** (Лёзьнянскі раён) за апошнія тры-чатыры месяцы не абмеркавала ніводнага пытаньня, зьвязанага са спэцыялізацыяй калгасу, з правільнай расстаноўкай і скарыстаньнем сіл калгаснікаў.

Задача партыйных арганізацый заключаецца ў тым, каб неадкладна пакончыць з недаацэнкай перабудовы партработы ў калгасах і разгарнуць палітычную і арганізацыйную работу сярод калгаснікаў, асабліва ў брыгадах.

У сыстэме перабудовы партработы расстаноўка партыйных сіл адыгрывае адну з важнейшых роляй. Цэнтральны камітэт УсеКП(б) 15 мая г.г. вынес спэцыяльную пастанову аб расстаноўцы партыйных і камсамольскіх сіл у калгасах і саўгасах. Пастанова прапануе ўсім партыйным арганізацыям **«не дапускаць намэтазгодных перакідак рабочых з вытворчасьці, партыйцаў, камсамольцаў і беспартыйных на нявытворчыя работы, дабіваючыся, наадварот, усямернага іх захаваньня на вытворчасьці і правільнай расстаноўкі на важнейшых вытворчых участках».**

Кожная ячэйка павінна дабівацца, каб камуніст на сваім вытворчым участку ў групе і брыгадзе быў сапраўдным арганізатарам мас, арганізаваў іх на выкананьне дырэктыў партыі.

Перад вясковымі партарганізацыямі надзвычай адказныя задачы стаяць па разгортваньні агітацыйна - прапагандысцкай работы. Зьмест нашай агітацыі і прапаганды, зьмест палітычна-масавай работы сярод калгаснікаў зараз вызначаецца тымі задачамі, якія пастаўлены пастановамі ЦК і СНК аб загатоўках збожжа і мяса, аб разгортваньні калгаснага гандлю. Гэтыя пастановы ЦК УсеКП(б) і Саўнаркому арганічна вынікаюць з генэральнай лініі партыі. Яны пакіраваны на далейшае ўмацаваньне і рост сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, на шырокае разгортваньне гаспадарчай ініцыятывы і самадзейнасьці калгаснікаў, на новы магутны ўздым, сацыялістычна арганізаваных, новых сіл сельскай гаспадаркі. Партыйныя ячэйкі зьмест гэтых партыйных дакумантаў павінны давесьці да кожнага калгасніка, павінны пранізаць гэтым зьместам усю агітацыйна-прапагандысцкую і палітычна-масавую работу. Агітацыя і прапаганда пастаноў партыі і ўраду, давядзеньне іх да мас, арганізацыя калгасных мас на аснове пастаноў партыі прадугледжвае бязьлітасную барацьбу з апартуністычнымі ўхіламі і ў першую чаргу супроць правага апартунізму, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прымірэнцтва да ўсякіх скажэньняў ад генэральнай лініі партыі.

Гаворачы аб перабудове партыйнай і масавай работы ў калгасах, нельга прайсьці міма фактаў скажэньня арганізацыйных прынцыпаў пабудовы партарганізацый. У калгасе **«Бальшавік Беларусі»** (Клімавіцкі раён) на радзе вытворчых вучасткаў замест партыйных груп стваралися кандыдацкія групы, як самастойныя адзінкі ячэйкі. У некаторых ячэйках **Хойніцкага, Магілеўскага, Дуброўенскага** і іншых раёнаў арганізоўваліся партыйныя ячэйкі пры наяўнасьці аднаго і двух членаў партыі і некалькіх кандыдатаў, што яўна пярэчыць статуту нашай партыі. Гэтыя скажэньні арганізацыйных прынцыпаў цягнуць за сабой рад іншых памылак, у прыватнасьці, у напрамку разгортваньня ўнутрыпартыйнай дэмакратыі (прыём і выключэньне) і інш.

Вясковыя партарганізацыі за апошнія гады значна вырасьлі і ўзмацнілі сваю работу ў барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. Гэта бясспрэчны факт. Але новыя ўмовы і задачы патрабуюць далейшага паляпшэньня работы нізавых партзьвеньняў у вёсцы, вымагаюць таго, каб раённыя камітэты ўзмацнілі сваё кіраўніцтва ячэйкамі, больш увагі аддалі справе перабудовы партыйнай работы ў калгасах, узмацнілі жывое кіраўніцтва і канкрэтную дапамогу калгасным і саўгасным ячэйкам КП(б)Б.

Трэба, каб кожная ячэйка, папулярызуючы ў масах пастановы ЦК і СНК, дабілася поўнага выкананьня і перавыкананьня плянаў веснавой сяўбы, новых посьпехаў у разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Трэба паставіць перад кожнай партыйнай ячэйкай задачу—стварыць моцны актыў з калгаснага беспартыйнага сялянства. Ясна, што гэтага можна дасягнуць пры разгортваньні палітычна-выхаваўчай работы сярод калгасных мас.

Узмацняючы нізавое партыйнае зьвяно, перабудоўваючы партыйна-масавую работу, разьвіваючы барацьбу за выкананьне плянаў веснавой сяўбы, партарганізацыі вёскі дабіваюцца новых посьпехаў у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

**Галодка.**

## Множыць вопыт перадавых

Трэцюю бальшавіцкую сяўбу саўгасы і калгасы **Глускага** раёну распачалі **на 15 дзён раней, чым у мінулым годзе.** За 15 дзён сяўбы, або на 10 мая, па раёне было засеяна 10.600 гэкт., што складае 28 проц. пляну. Ужо на сёнешні дзень саўгасы засеялі звыш 35 проц. яравога кліну. **Каля 20 калгасаў закончылі пасеў збожжавых культур.** Узоры бальшавіцкай работы паказвае саўгас **Харомцы** і **Веснава,** якія выканалі плян веснавой сяўбы на 55-60 проц. У барацьбе за пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы першымі ідуць калгасы **«Новае жыцьцё», «Чырвоны штандар»** і **«Серп і молат».**

Гэтыя посьпехі перадавых саўгасаў і калгасаў ёсьць вынік таго, што партарганізацыі гэтых саўгасаў і калгасаў, на аснове перабудовы сваёй работы па-новаму, па-бальшавіцку змагаліся за ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК аб арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў. У калгасах правільна арганізавана работа па вытворчасьці, добра наладжан улік працы кожнага калгасніка, лепшыя ўдарнікі вытворчасьці прэміяцца.

У тых калгасах, дзе дасягнута вялікая гаспадарчая эфэктыўнасьць («Бальшавіцкая перамога», «Юны барацьбіт» і інш.), беднякі і сераднякі—аднаасобнікі падаюць заявы аб уступленьні ў калгас.

Трэба адзначыць, што вопыт партработы перадавых калгасаў зусім невыстарчальна папулярызуецца ў адстаючых гаспадарках. У паасобных калгасах і вёсках раёну яшчэ да гэтага часу нічога пя зроблена ў справе папулярызацыі апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжа і жывёлазагатоўках і с.-г. падатку на 1932 г. У калгасах, дзе партыйныя ячэйкі (Макавіцкая, Казловіцкая і інш.) не павярнуліся тварам да калгаснай вытворчасьці, не мабілізавалі шырокіх калгасных мас і працоўных аднасобнікаў на ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, веснавая сяўба праходзіць вельмі марудна.

**М. Дзяніскевіч.**

1-шы ўсесаюзны конкурс па воднаму транспарту

# Ператварыць конкурс у масавае спаборніцтва ўсіх воднікаў БССР

### Старт дан

Перавозка грузаў па вадзе зьяўляецца найбольш танным відам транспарту. Вялізарны размах сацыялістычнага будаўніцтва і рост у сувязі з гэтым грузапатоку па чыгунках з усёй сілай патрабуе поўнага скарыстаньня воднага транспарту.

У бягучым годзе рэчны транспарт павінен перавесьці значна больш грузаў і пасажыраў, чым летась (65,9 млн. тон грузаў і 46 млн. пасажыраў па ўсёй сыстэме рэк СССР і 690.000 тон грузаў па Дняпра-Дзьвінскім-рэчным транспарце).

Выканаць гэты плян магчыма будзе тады, калі работа на прыстанях і на суднах будзе пастаўлена на бальшавіцкія рэйкі, калі 6 умоў тав. Сталіна будуць не на словах, а на справе ажыцьцяўляцца, калі выраўнаўчэк і расхлябанасьць будуць рашуча вытручаны, а ў штодзённай рабоце будуць ужывацца вышэйшыя формы сацыялістычнай працы, калі масавая работа і культурна-бытавое абслугоўваньне будуць пастаўлены на патрэбную вышыню.

Матар'ялы з месц (Віцебск, Гомель, Рэчыца) сыгналізуюць аб тым, што супроць бясплянавасьці, непрадукцыйных прастояў суднаў, парушэньняў працдысцыпліны, адсутнасьці ўліку і нездавальняючай арганізацыі рабочага снабжэньня няма рашучай барацьбы, такой, якую патрабуюць партыя і ўрад. У той час, калі трэба максымальна скарыстаць наяўны тайнаж, не дапусьціўшы ні аднэй гадзіны прастояў суднаў, ні аднэй тоны недагрузак—у Гомелі, Віцебску і Рэчыцы судны прастойваюць цэлыя дэкады.

З мэтай павышэньня якасьці работы рэчнага транспарту, укараненьня 6 умоў тав. Сталіна і сацыялістычных мэтадаў працы, выкананьня і перавыкананьня пляну навігацыі газэты «Правда» і «Водный транспорт», Наркамвод і ЦК воднікаў абвясьцілі ўсесаюзны конкурс імя трэцяй гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва на лепшае судна і прыстань. 20 мая—старт усім суднам, якія будуць прымаць удзел у конкурсе. Фініш — 1 жніўня.

Адначасова з усесаюзным конкурсам ДДРТ абвясьціў конкурс па басэйне на лепшую прыстань, буксірнае, грузапасажырскае і непаравое судна. Абвяшчэньне конкурсу па басэйне дае магчымасьць больш ахапіць спаборніцтвам масы воднікаў.

Воднікім арганізацыям павінны аказаць дапамогу тэрытарыяльныя арганізацыі, у першую чаргу па лініі забесьпячэньня поўнага выкананьня абавязацельстваў клієнтурай.

«Зьвязда», уключаючыся ў конкурс, заклікае ўвесь друк БССР разгарнуць на сваіх старонках шырокую папулярызацыю задач і ўмоў конкурсу, асьвятленьне ходу барацьбы лепшых суднаў і воднікаў за пярэдніцтва, мабілізаваць на выкананьне і перавыкананьне ўмоў конкурсу.

Вышэй сьцяг спаборніцтва! Ператворым конкурсы ў масавае спаборніцтва ўсяго рэчнага транспарту за выкананьне і перавыкананьне трансфінпляну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

### Гомель уключыўся

**Гомель.** (Наш кар.).

Гомельскі водны раён уключыўся ў конкурс па лепшую прыстань і судна. Па прыстанях і на суднах разгарнулася шырокая прапаганда ўмоў конкурсу. Трыкутнік раёну пастанавіў праводзіць улік працы на суднах не па-дэкадна, як гэта было да гэтага часу, а пасьля кожнага рэйсу. Абвяшчэньне конкурсу сустрэта воднікамі з вялікім уздымам.

### Работа не перабудавана

РЭЧЫЦА.

Перавозка грузаў праводзіцца надзвычай марудныміі тэмпамі, плян у красавіку ня выканан. Гэта зьяўляецца вынікам таго, што работа рэчнага транспарту не перабудавана. Ва ўсёй сыстэме панае апартуністычны самацёк. Сацспаборніцтва не ўзначалена. Культмасавай работы няма.

Ёсьць вялікія непрадукцыйныя прастоі суднаў. З 15 красавіка стаяла больш за 10 дзён непагружанае 800-тоннае судно. Завод імя Томскага сыстэматычна зрывае пагрузку не падвозячы да прыстані грузаў.

Пры абгаварэньні трансфінпляну з боку некаторых брыгад быў высунут сустрэчны плян. Але з прычыны адсутнасьці якога-бы там ні было ўліку вынікі невядомы.

Забесьпячэньне рабочых пастаўлена дрэнна. Апрача вынясеньня прыгожых рэзалюцый і пастаноў практычнага па гэтым пытаньні амаль нічога ня зроблена.

**БАРСУКОЎ.**

### Непрадукцыйныя прастоі суднаў зрываюць плян

ВІЦЕБСК. Першыя рэйсы па Віцебскім раёне далі добрыя рэзультаты.

Тэмпы перавозак грузаў з кожнай пяцідзённай павялічваюцца. Калі за трэцюю пяцідзённку красавіка было перавезена 1.536 тон грузаў, дык за чацьвертую ўжо—4.311 тон і за пятую—4.374 супроць пляну 3.800 тон за кожную пяцідзённку. Заданьне па пасажырскім руху таксама значна перавыканана. Гэтыя посьпехі ёсьць просты рэзультат правільнага кіраўніцтва з боку партыйнай і прафэсыянальнай арганізацый.

Як адмоўнае трэба адзначыць вялікую загружанасьць прыстані. Клієнтура вельмі марудніць з разгрузкай і адвозкай грузаў. Па віне апошняй бываюць непрадукцыйныя прастоі суднаў. З 22 па 26 красавіка стаяла нерозгружанай лайба з бульбай, якая належыць Велікскаму райсаюзу. Пад'ёмное і больш сутак затрымліваў выгрузку суднаў пчготачны камбінат і інш.

Ёсьць выпадкі, якія сьведчаць аб слабай працоўнай дысцыпліне. Па віне лайба - корніка **Сцэрьнізэнта** былі два выпадкі затапленьня лайб вадой. У выніку судны былі выведзены са строю.

Пералічаныя недахопы патрабуюць самай сур'ёзнай увагі з боку кіраўніцтва рэчнага транспарту.

**Воднік.**



Пасажырскі параход імя Молатава (Гомель) выходзіць у рэйс

## Стралковаму паходу камсамолу—бальшавіцкія тэмпы

Па пачыну «Комсомольской правды» і камсамольцаў Баўманаўскага раёну (Масква) з 1 сьнежня праходзіць стралковы паход-конкурс камсамолу.

Асноўнымі задачамі паходу зьяўляюцца: разгортваньне масавай прапаганды стралковых ведаў і стралковага спорту, забесьпячэньне рэалізацыі пляну Асоавіяхіму па стралковай рабоце з пагалоўным уцягненьнем у гэтую справу камсамолу, падрыхтоўка з камсамольцаў пэўнай колькасьці стралкоў палявой і ціравой клясыфікацыі, разгортваньне масавага паходу за аўладаньне баявой зброяй.

Для найбольш дакладнага і пасьпяховага правядзеньня работы паход быў падзелен на тры маршруты.

У часе першага маршруту асноўнай мэтай было пастаўлена шырокае разгортваньне масава - растлумачальнай работы вакол конкурсу, абсталяваньне ціраў і стрэльбішч, стварэньне сеткі гурткоў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы інструктароў і кіраўнікоў стралковай справы. Таксама ў гэты пэрыяд павінен быў рабіцца адбор камсамольцаў для ўдзелу ў конкурсе.

Другі маршрут зьяўляўся пэрыядам правядзеньня самога конкурсу. Сюды адносіцца спаборніцтва паміж пунктамі, паміж стралковымі гурткамі і стралявымі адзінкамі.

На працягу трэцяга маршруту праводзяцца ўсебеларускае і ўсесаюзнае спаборніцтвы. Гэты пэрыяд павінен зьявіцца замацаваньнем дасягнутых вынікаў.

Як-жа праходзіць стралковы паход камсамолу па БССР? На жаль, прыходзіцца даць адмоўны адказ. **Стралковы паход-конкурс ідзе нездавальняюча.** Большасьць райсаветаў і райкомаў КСМ канкрэтна не займаліся пытаньнем конкурсу і не кіравалі вылучанымі штабамі.

Паход-конкурс многія арганізацыі зразумелі, як кароткую кампанію. Мэты і задачы яго не даведзены да кожнага камсамольца. Не вядзецца шырокай масавай работы. Спаборніцтва і ўдарніцтва разгортнуты толькі па асобных ячэйках.

У выніку **ў стралковы паход уключылася толькі 28 раёнаў,** а даныя аб рабоце на сёнешні дзень ёсьць толькі ад Віцебскага, Менскага і Чашніцкага раёнаў. **Раёны Бялыніцкі, Бярэзінскі, Буда-Кашалеўскі, Глускі, Камарынскі, Каралінскі, Кармянскі, Касьцюковіцкі, Лёзьнянскі, Лоеўскі, Прапойскі, Пухавіцкі, Расонскі, Хойніцкі, Чавускі, Чачэрскі, Чэрыкаўскі, Чырвонапольскі зусім у конкурс ня ўключыліся.**

Для таго, каб даць магчымасьць усім арганізацыям уключыцца ў гэту кампанію і дабіцца найлепшых вынікаў, ЦК ЛКСМБ і ПС Асоавіяхіму БССР апошні маршрут конкурсу працягваюць да 15-га чэрвеня. Для ажыўленьня работы разасланы на раёны 28 брыгад.

Буйныя прамысловыя арганізацыі, як Менск, Гомель, Магілеў, Бабруйск, Мазыр, Рэчыца, Полацак **абавязаны арганізаваць перасоўчныя ціры і школы для адпрацоўкі клясных стралкоў у сацыялістычным сэктары вёскі.** Гарадзкія саветы АСО павінны праз мэтады брыгаднай работы дапамагчы вучэбным пунктам у разгортваньні стралковага спорту і адпрацоўцы клясных стралкоў.

Для папулярызацыі конкурсу ўсім саветам Асоавіяхіму і паасобным ячэйкам неабходна **арганізаваць вітрыны ходу конкурсу,** якія-б адлюстроўвалі як станоўчыя, так і адмоўныя бакі работы і побач з гэтым выяўлялі лепшых стралкоў.

Трэба практыкаваць **зьлёты клясных стралкоў і стралковыя канфэрэнцыі,** дабівацца шырокага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

З боку сутаварыскіх вайсковых часьцей патрабуецца максымальная дапамога ў разгортваньні конкурсу, у першую чаргу інструктарскім пэрсаналам, а таксама неабходнай матар'яльнай вучэбнай базай. Нельга далей мірыцца з тым, што рад прафсаюзных арганізацый стаяць у баку ад стралковага паходу.

Да ўсебеларускага спаборніцтва дапускаюцца Віцебская, Менская, Бабруйская, Гомельская арганізацыі. Але і ўсе астатнія арганізацыі павінны пэрыяд, які застаецца, максымальна скарыстаць для разгортваньня работы, каб мець магчымасьць уключыцца ва ўсебеларускае спаборніцтва.

**Я. ФЕДАРОВІЧ.**

ЗЬМ. ПАВАРОТНЫ

# Аўто разьвівае ход

Дарога простая, роўная, бясконцая. Як сьветавая лінія далёкага пражэктара ў цёмную ноч ляціць яна ў бязьмежныя прасторы і сваім нябачным вастрыём хаваецца ў сінім акрайку неба. Узгоркі праразае дарога адточаным мячом, нізкія месцы, лугі і даліны праскаквае ўтрамбаванымі насыпамі, грэблямі, мастамі.

Дарога сьвежая, юная, румяная. Абапал ярка жоўты пясок і высокія «дзяды» з чорнымі шапкамі. Гэта арыгінальна - прымітыўныя даведкі аб выкусанай лапатамі зямлі. Якы, як каравульныя, вартуюць гераічную працу людзей, юнасьць першаклясной дарогі, учарайшыя выбоіны і «чортавы вокны» на гэтым старасьвецкім «кацярынінскім» бальшаку.

Мякка коціцца «фордзік». Ён молад, як і гэта новая смалою і нафтай пратлушчаная шчабнёўка. У яго паслужным сьпісе—на круглекім аўтаматычным вымяральніку толькі яшчэ 200 кілёмэтраў нясьмелай дзіцячай хады па маскоўскіх вуліцах і тройчы пастолькі дарогі ў Менск.

Машыну вядзе старшыня аўтадораўскага праўленьня. На чорным стырпавым коле напрактыкавана ляжаць рукі. Сыстэмай каленчатых вагарыкаў і хроманікелевых шасьцяронак гэты вадзіцель прабуе машыну, прымушае карданны вал і дыфэрэнцыял рабіць то большую, то меншую колькасьць абаротаў. Вадзіцель правярае ход машыны, яе мажэўранасьць і спрыт, трывалась каробкі скорасьцей.

Уключан першачны вал. Аўтамабіль ідзе са скорасьцю 40 кілёмэтраў у гадзіну. Паваротам вагарыка ўключаецца наўторны вал. І машына яшчэ больш прытінаецца да зямлі, насечкамі гумавай пакрышкі яна нібы вострымі кіпцюрамі ўпіваецца ў каменную адзежу дарогі. Аўтамабіль, як кошка робіць рэзкі скачок, спаборнічае з птушкамі, пераганяе вецер. — Восемдзесят! — кажа вадзіцель, глянуўшы на аўтаматычны вымяральнік. Цяпер уключан конт-шафтавы вал і машына ідзе трэцяй скорасьцю.

І тады здаецца, што чорная кропка крытага «фордзіка» астыўшы стаіць на месцы, а прасторы і лясы, узгоркі і даліны самі ўперагонку бягуць да людзей.

Такімі дарогамі, нашымі савецкімі амаўкамі, яраслаўкамі, амэрыканскімі «фордзікамі», «бюікамі», «шэвролэ» заваяваны кілёмэтры, перамагаецца прастора і час.

Па новай, нашымі рукамі пабудаванай дарозе, аўтамабіль разьвівае крайнюю шпаркасьць, хаваецца з вачэй нібы прызёмным лётам каршак.

Тады вы ў палоне шчасьлівага хваляваньня. Вас ахапляе глыбокая радасьць. Вы часьцей чуеце прыемны гуд матору, вы бачыце, як нялкі Саюз садзіцца на савецкі аўтамабіль. І гэтых аўтамабіляў — рушыцца цэлая лявіна, магутная калёна, бурная веснавая паводка.

Памешчыцка-буржуазная Расія за пяць год (1910-1915 г. г.) выпусьціла на руска-бальтыцкім заводзе ў Рыжы **451 машыну.** Дзевяноста ў год. **Адну** машыну за пяцідзёўку. Такавы былі, з дазволу сказаць, тэмпы «матушкі... Расеі»!

Да вайны ўся былая руская імпэрыя —ад вярхоўя Віслы да далёкіх ціхаакіянскіх берагоў—мела толькі **9.930 аўтамабіляў.** Па дарогах вольнай краіны Саветаў **ужо ў 1926 г.** хадзіла **18.746** машын. У 1931 г. армія бязрэйкавага транспарту мела **45.723** аўта-адзінак. Апошнія дні першай пяцігодкі будзем браць на дзвухстах тысячах аўтамабіляў розных марак. Большая палова іх будзе **цалкам нашых,** зробленых рукамі савецкіх ударнікаў, на **савецкіх аўтагігантах** і з савецкага матар'ялу. У трэцім годзе пяцігодкі сышло з савецкага канвэеру **20.000,** а ў заключным годзе сыйдзе **78.000** новых зялёных грузавікоў, галубых аўтобусаў і вёрткіх «фордзікаў».

Гэта вельмі яшчэ мала ў параўнаньні з тым, што маюць капіталістычная Эўропа і «краіны даляраў». Сусьветным аўтамабільным перавозкам у мінулым годзе было зарэгістравана **35.810.768** машын усіх тыпаў. З іх у **Амэрыцы** — 28.788.238 штук; у **Эўропе** — 5.987.472, а рэшта падае на **ўсе астатнія** краіны і дзяржавы земнай кулі.

Перад гэтымі васьмізначнымі лічбамі-коласамі савецкія дзьвесьце тысяч здаюцца маленькімі, няпрыкметнымі. Але гэта толькі так з вонкавага боку. Падыйдзеце бліжэй. Уважліва прыгледзьцеся. Наша шасьцізначная скромная колькасьць аўтамабіляў энэргічна ўступае ў барацьбу з эўрапэйска-амэрыканскімі коласамі і **перамагае** іх, **абганяе** іх, пакідае **ззаду.**

Адгарнеце назад толькі два гады. 1930. Маленькую Манастырку абкружалі тады гнілыя балоты, пяскі, пакрыўджаны хмызьняк. Прышлі людзі з нівэлірамі і іншымі прыборамі. Вымяралі, ставілі афарбованыя колічкі, запісвалі. Потым прыехала **трыццаць тысяч** рабочых, тэхнікаў, інжынэраў. Тут былі выдатныя замежныя спэцыялісты. Тут быў і сам містэр **Брайант,** прэзыдэнт амэрыканскай фірмы «Осьціи і К-°».

Першага студзеня 1932 году, у вызначаны партыяй тэрмін, **Ніжагародзкі аўтагігант імя Молатава** ўступіў у строй бальшавіцкай кагорты сацыялістычнай індустрыі. За 18 месяцаў збудован **першаклясны аўтамабільны гігант,** суперніка якому **няма** на зямлі.

Самы вялікі фордаўскі завод у Канадзе ў часе свайго росквіту мог выпускаць у год 110.000 аўтамабіляў. Савецкі Ніжагародзкі аўтагігант будзе даваць **140 тыс.** грузавых і малалітражных аўтамабіляў, а ў другой пяцігодцы яго гадавая вытворчая праграма будзе даведзена да **200 тыс. машын.**

Маскоўскі «АМО» стаў сацыялістычным **аўтагігантам імя Сталіна.** Да рэканструкцыі стары маскоўскі заводзік даваў у год **3.500 машын.** Занава адбудованы, абсталяваны самымі павейшымі і ўдасканаленымі варштатамі, першаклясны сталінскі аўтагігант сёньня **дае кожны дзень 60 «амавак»,** а ў 1933 годзе выпусьціць **70 тыс.** грузавых машын і пасажырскіх аўтабусаў.

З маленькіх рамонтных майстэрань расьце трэці аўтагігант—**Яраслаўскі завод.** У другім годзе пяцігодкі яраслаўскія майстэрні маглі даць краіне толькі 208 грузавых машын. У бліжэйшыя-ж гады вытворчая гадавая магутнасьць заводу будзе даведзена да **20 тыс.** шматтонных «яраславак».

Гэта першыя савецкія гіганты аўтамабільнай прамысловасьці, пабудаваныя для таго, каб **«пасадзіць СССР на аўтамабіль».** Гэта грозны пачатак бурнага насычэньня краіны бязрэйкавым маторным транспартам.

Утрамбоўка шасэйнай дарогі

Аўтазаводаў будзе дзесяткі. Яны вырастуць на новых, цяпер пустых і малалюдных прасторах. У другой пяцігодцы рост аўтапарку будзе праводзіцца такімі тэмпамі, каб ужо ў 1937 годзе ў яго ўліць **мільён** новых уласных аўтамабіляў і **160 тыс.** савецкіх трактараў. А ўсяго да канца другой пяцігодкі разьмеры нашага аўтапарку дасягнуць **2.300** тысяч машын.

Аўтамабільны король Форд у 1929 годзе у газэце **«Н'ю-ёрк Таймс»** пісаў: **«Можа быць СССР патрэбна столькі-ж аўтамабіляў, як і Амэрыцы? Не! СССР мае патрэбу ў большай колькасьці і няма ніякіх прычын для таго, каб ён ня змог вырабляць і эксплёатаваць іх — гэта толькі пытаньне арганізацыі і часу».**

У гэтым містэр Форд не памыляецца. Яго прыпушчэньне — ня вынік вялікай сымпатыі і любві да пралетарскай краіны. Посьпехі нашага будаўніцтва, рост сацыялізму **прымушаюць** людзей з другога берагу гаварыць пра Савецкі саюз **інакшай** мовай.

Камуністычныя мэтады, бальшавіцкія тэмпы ў рабоце да мінімуму скарачаюць, сьціскаюць фордаўскае адцягнае «пытаньне арганізацыі часу». Сёнешняя скромная лічбіна аўтамабіляў у СССР, у другой пяцігодцы вырасьце ў сямізначную, звыш двохмільённую **лічбу-унікум.**

Гэта ўжо вельмі **многа!** І наш рост, дынаміка, разьвіцьцё шпаркасьці касьць. Вось толькі што машына праз Ляхаўку выскачыла з гораду, перасекла чыгуначнае палатно, далёка пакінула рабочы пасёлак «Камінтэрн». Хутка праскочылі кілёмэтры новай дарогі. А там, пад Сьмілавічамі да колічка прыбіта дошчачка з надпісам. Літары дажджом вымыты, разьбеглися. Асобныя значкі зусім прапалі. Усё-ж можна прачытаць: «Праезд яма».

Дошчачка стаіць у канцы шашы і паведамляе, што для аўто праезду няма. Тут канчаецца аўтамабільны тракт і далей — **дарога-яма.** Людзі вылезьлі з машыны, а вадзіцель хацеў яшчэ ўлетцы праехаць па выбоях. Калёсы танулі ў ліпкую гразь, як у бяздоньне. Зьнікла спакойная музыка матору. Фордзік стогне, капляе пераграм, буксуе, просіцца, як жывы. Людзі за калені лезьлі ў халодную веснавую гразь, на руках вывозілі машыну на цьвёрды грунт...

Вялікая краіна Саветаў перасечана мільёнам чатырыста восемдзесят тры тысячы шэсьцьсот кілёмэтраў дарог. З гэтай колькасьці — ўсяго толькі **2,7 проц.** дарог з цьвёрдым пакрыцьцём. Агульная працягласьць дарог **у БССР** —66.700 кілёмэтраў.

Дарогамі вышэйшага гатунку зьяўляецца асфальт і бэтон. У 1931 годзе ПАЗШ мелі асфальта-бэтонных дарог **3.104 клм.** Такіх-жа дарог па ўсім нашым Саюзе ўпяршыню ў тым годзе пабудавана **27 клм.**

Нашы разьбітыя, калдобінныя «бальшакі» і «прасёлкі» — як і многае іншае, напрыемная **спадчына мінулага.** Царская Расія будавала дарогі «тэмпамі» ў **22 разы ніжэйшымі** за францускія і ў 16 — за ангельскія.

**Савецкі саюз садзіцца на аўтамабіль** і аўтамабіль ня можа хадзіць па «расейскіх» дарогах. Кожная выпушчаная «амаўка» патрабуе сустрэчы яе новымі вучасткамі цьвёрдых шляхоў, **патрабуе сабе праезду.** Краіна сацыялізму павінна і будзе мець добрыя дарогі. У 1931 годзе намі пабудавана **17.000** клм. новых аўтамабільных дарог, а ў заключным годзе першай пяцігодкі ў фронт разьленьня ўключыцца яшчэ **87.000** клм.

Нашы дарогі далёка **адсталі** ад агульнага росту краіны. Гэты вучастак [illegible] дарожнага будаўніцтва **нарастаюць** з году ў год. У 1932 годзе **ўпецярым** нашы тэмпы ў параўнаньні з трыццаць першым. Другая пяцігодка вызначае адзэй з кравугольных задач — **ва многа раз** большы размах дарожнага будаўніцтва і рост бязрэйкавага транспарту.

У 1932 годзе Савецкі саюз, яго дарожна-будаўнічыя арганізацыі будуць змагацца за поўнае асваеньне ўкладаў у дарожную гаспадарку ў **820** млн. руб. Працоўны ўдзел пасельніцтва — гэта невычарпальная крыніца сіл і магчымасьцяй для бальшавіцкіх перамог у барацьбе за добрую дарогу —павінен даць натуральны эфэкт у **380** млн. руб.

У 1931 годзе працоўны ўдзел у дарожным будаўніцтве застаўся перад краінай у вялікім даўгу. Па **БССР,** напрыклад, плян працоўнага ўдзелу насельніцтва выканан толькі на **52 проц.** Першымі ў **Савецкім саюзе** ідуць **Чувашыя і Марыйская** вобласьць. Імі працоўны ўдзел даведзен да 130 проц. Перадавікі **БССР — Полацак, Чэрвень, Асьвея, Дрыса.** Беларускі камсамол за двухтыднёвік барацьбы з бездарожжам адпрацаваў каля **40.000** працадзён. Але ўсё гэта мала і не задавальняе патрэб краіны.

Заключны год пяцігодкі павінен быць упісан у гісторыю сацыялізму новымі тысячамі добрых аўтамабільных дарог. Удзел і энтузіязм шырокіх працоўных мас у дарожным будаўніцтве можа і павінен быць **павялічан у некалькі разоў.** Аўтамабілізацыя краіны патрабуе, каб кожны працоўны быў **актыўным аўтадораўцам.**

І тады Пленчаніцы, Бягомль, Чэрвень, Бярэзіна, Кашыль ня будуць «беларускімі камчаткамі», куды можна даехаць толькі самай дарогай. Тады **(а гэта зусім блізка)** па шляхах будзе менш надпісаў «праезду няма» і аўтамабіль пасьля першага разгону ня будзе буксаваць і прасіцца ў лінкай трасі. А два-паўтары мільярды, лічы штогод трацілі мы ад бездарожжа, пойдуць на новыя аўтагіганты, на новыя сотні тысяч кілёмэтраў удасканаленых дарог.

Менск, друкарня «Зьвязды»

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

# РАБОТУ ШКОЛЫ—НА ЎЗРОВЕНЬ ЗАДАЧ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАНЬНЯ

## Усебеларускі конкурс на лепшую школу і лепшага настаўніка

У сьвятле пастаноў XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі задача пабудовы **палітэхнічнай школы** набывае асаблівае значэньне. Пабудова і замацаваньне палітэхнічнай школы, як важнейшага вагара перабудовы сьвядомасьці людзей, «**выхаваньня пакаленьня, здольнага канчаткова ўстанавіць камунізм**» (з праграмы УсеКП(б) зьяўляецца для партыі, пралетарыяту і ўсіх працоўных актуальнейшым пытаньнем.

Пастулярызацыя пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй асьвеце ўзьняла шырокую пралетарскую грамадзкасьць, масы настаўніцтва на перабудову палітэхнічнай школы.

**Урэцкая** ШКМ, **Бытчанская** пачатковая школа, **8-я ФЗС г. Віцебску** і шм. па-бальшавіцку ўключыліся ў барацьбу за зьнішчэньне недахопаў у сваёй рабоце. Гэтыя перадавікі перайшлі на новыя праграмы і пастаянныя разклады працы, дабіліся значных посьпехаў ва ўзьняцьці якасьці вучобы.

Але, на жаль, такіх прыкладаў і ўсюды толькі дзесяткі. У значнай большасьці школ **карэннага пералому** ў працы **яшчэ няма.**

Асноўны недахоп — нездавальняючы ідэйна - асуцярыньня веды вучняў — ліквідуецца **слабымі тэмпамі.** Палітэхнізацыя масавай школы праходзіць нездавальняюча. Піянэрскія і камсамольскія арганізацыі ўсё яшчэ спатыкаюць у рабоце за якасьць вучобы і сьвядомую дысцыпліну вучняў.

У рэшце месц ярка выяўляецца непасьпешна правасаюзнай-трудзкі падыход, якая заключаецца ў **славеснасьці, схаластычнасьці выкладаньня**, у адрыве навучаньня ад грамадзкай і вытворчай працы. Разам з гэтым ёсьць розная характару і «лякацыя» скаскэньні, адмоўна - пасіўнае ролі настаўніка, цьвёрдых праграм і г. д. Гэта ўсё тавораць аб тым, што барацьба за выкананьне пастановы ЦК партыі аб школе яшчэ далёка ня скончана. Яна пераходзіць у новую стадыю, у стадыю больш паглыбленай працы, больш кваліфікаванага мэтадычнага кіраўніцтва.

Конкурс на лепшую палітэхнічную школу, які цяпер праводзіцца ў БССР, ставіць перад сабой задачу выявіць лепшыя ўзоры працы школы і настаўніка, перанесьці гэтыя станоўчыя ўзоры на ўсе рабіны БССР.

У працэсе гэтага конкурсу-агляду, бязумоўна, выявяцца скаскэньні лініі партыі ў практычнай рабоце школ.

Праводзячы конкурс, трэба мабілізаваць усю пралетарскую грамадзкасьць на бязьлітую з правасаюзнай практыкай, як галоўнай небясьпекай, і «лякацыямі» скаскэньнямі ў практыцы і тэорыі школьнага будаўніцтва, узбросіць масавага настаўніка падагагічнымі і мэтадычнымі ведамі.

**Першачарговай, кіраўгольнай задачай конкурсу зьяўляецца мабілізацыя шырокіх працоўных мас, чырвонасьцяжнага настаўніцтва і ўсіх працоўных на далейшае хуткае і поўнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй школе.**

Надзвычай сур'ёзную ўвагу неабходна аддаць пытаньням **школьнага рэжыму**, увутранога распарадку, на санітарыю і гігіену, на арганізацыю дзіцячага адпачынку. Лёзунг «**беражы і ўзмацняй здароўе дзяцей**» неабходна шырока папулярызаваць і ажыцьвіць на практыцы у жыцьцё.

Конкурс на лепшую палітэхнічную школу і настаўніка праводзіцца з 1 мая да 20 чэрвеня, адказ у той час, калі мы робім падагуленьне вынікаў сёлетняга навучальнага году і разгортваем падрыхтоўку да 1932-33 навучальнага году. Гэта акалічнасьць ускладае на конкурс асабліва вялікія задачы. Для таго, каб найбольш арганізавана і з лепшымі паказальнікамі скончыць навучальны год, шырока разгарнуць падрыхтоўку да новага, пасьпяхова правесьці ўсебеларускі конкурс, патрэбна **ўзмоцненае партыйнае кіраўніцтва ўсёй гэтай работай на месцах.**

«Пастаўленьні пленумам ЦК і ЦКК задачы далейшага паглыбленьня і станоўчага выраўнаньня задач культурнай рэвалюцыі магчымы толькі пры ўмове непрымірымай барацьбы за генэральную лінію партыі, рашучай барацьбы на два фронты і патрабуюць ад усёй КП(б)Б, ад усёй рабочай класы яшчэ, большага кіраўніцтва, актыўнага і непасрэднага ўдзелу ў справе культурнага будаўніцтва, памятаючы, што далейшыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў значнай ступені залежаць ад выраўнаньня гэтых задач» (з пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб культурным будаўніцтве БССР).

Так запісаў апошні пленум ЦК нашай партыі, абавязваючы ўсе партыйныя арганізацыі аддаваць значна большую ўвагу задачам культурнага будаўніцтва і, у прыватнасьці, рабоце нашай палітэхнічнай школы. Гэтыя простыя ўказаньні ЦК нашай партыі павінны быць цалкам ператвораны ў жыцьцё.

**АКУЛІК.**

## Уключыліся ў конкурс, узялі самаабавязацельствы

**КАЛІНКАВІЦКАЯ ЧЫГУНАЧНАЯ ФСЗ** у гэтым навучальным годзе ў аснову ўсёй сваёй работы паклаў барацьбу за ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб школе. У выніку мы маем значныя дасягненьні па ўздыме якасьці вучобы, а таксама пашырэньні агульна-адукацыйных ведаў вучняў.

У сувязі з правядзеньнем усебеларускага конкурсу на лепшую палітэхнічную школу і лепшага настаўніка, наша фабрычна-заводзкая сямігодка ўключылася ў конкурс і ўзяла на сябе наступныя самаабавязацельствы:

Вывіць і канчаткова зьнішчыць карэнныя недахопы ў рабоце ФЗС як па лініі мэтодыкі выкладаньня, так і ў плянаваньні і ўліку;

дэтальна вывучыць пастаноўку вытворчага навучаньня ў рабочай майстэрні, і на прадпрыемстве зьвязаць вытворчае навучаньне з тэарэтычным матэрыялам, азнаёміць вучняў з інструментамі і варштатамі, значна пашырыць колькасьць працоўна-тэхнічных навыкаў;

вучняў, якія добра выканалі свае заданьні і жадаюць больш глыбока прапрацаваць поўны матэрыял, у часе канікул ахапіць кароткатэрміновымі тэхнічнымі курсамі;

вылучыць групу лепшых настаўнікаў, вывучыць іх вопыт, мэтодыку іх работы для таго, каб перадаць іх другім настаўнікам.

Калінкавіцкая фабрычна-заводзкая сямігодка выклікала ў сувязі з гэтымі самаабавязацельствамі пасьледаваць яе прыкладу ўсе школы Мазыру і Калінкавіч.

**ГРОДАЎ, РЫМАШЭЎСКІ.**

# КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА ПА ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ—НА ПОЎНЫ ХОД!

**Увядзеньне ў строй новых заводаў—рашаючае зьвяно індустрыялізацыі, важнейшая прадпасылка выкананьня прамфінпляну чацьвертага, заключнага**

## Фарсаваць будаўніцтва Быхаўскага ацэтонавага заводу

Ацэтона-бутылавая прамысловасьць зьяўляецца зусім новай галіной вытворчасьці, якая атрымала права грамадзянства толькі ў апошнае дзесяцігодзьдзе. Эўропа і Амэрыка налічваюць разам ня больш 6-8 ацэтона-бутылавых заводаў.

Быхаўскі завод, гэта пярэшнец ацэтона - бутылавай прамысловасьці Саюзу. Лака-фарбавая вытворчасьць, якая разьвіваецца ў савецкай Краіне, патрабуе тысячы тон каштоўнага растваральніка, якім зьяўляецца ацэтон.

Здавалася-б, усе арганізацыі павінны былі аддаць максімум увагі пытаньню хутчэйшага пуску Быхаўскага заводу.

У дзень 1 мая ў Быхаве адбыўся пробны пуск асноўнага пэрву заводу — цеплаэлектрастанцыі. Гэты пуск быў забясьпечан, дзякуючы гераізму рабочых і тэхнічнага пэрсаналу, разгортваньню сацсаборніцтва і ўдарніцтва. Ня гледзячы на недахват асноўных будматар'ялаў, дзякуючы пасьпяховай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і дапамозе раённых кіруючых арганізацый, удалося пробны пуск ажыць цяпіць да тэрміну. Аднак, будаўніцтва самога заводу ідзе надзвычай павольнымі тэмпамі. Пытаньне аб ходзе і тэмпах будаўніцтва ня раз стаяла ў дырэкцыйных органах, апошнія вынесьлі катэгарычныя пастановы, якія абавязвалі будаўнічыя арганізацыі фарсаваць тэмпы работ, але гэтыя пастановы засталіся нявыкананымі.

Будаб'яднаньне, якое абавязалася скончыць усе будаўнічыя работы, зьвязаныя з мантажом ЦЭЦ, да 28-га студзеня 1932 г., нават не прыступіла да работы. Кіраўніцтву заводу прышлося, каб не сарваць пуску станцыі, праводзіць будаўніцтва ўласнымі сіламі.

Каб скончыць пабудову вытворчых карпусоў, каналізацыі, вадаправоду, будаб'яднаньне павінна было перакінуць матар'ялы і разгарнуць ударныя работы з 1 красавіка. Замест таго, каб выканаць узятыя на сябе абавязацельствы, аб'яднаньне проста расфармавала Быхаўскае аддзяленьне. Да 1 студзеня будаўнічыя работы былі выкананы на 85 проц. і в таго часу пінкай работы не праводзіцца. Хто скончыць будаўніцтва — невядома.

Белмэталяаб'яднаньне — асноўны пастаўшчык абсталяваньня — здало яго са спазьненьнем на год. Толькі 1-га мая прыбылі першыя часткі.

Абсталяваньне, заказанае на розных заводах СССР, поўнасьцю прыбыла на пляцоўку і змантавана на 60 проц. Галоўны тормаз у мантажы — гэта недахват балтоў і труб, на віне Белдзяржсэнабу, які не паклапаніўся забясьпечыць будаўніцтва гэтымі матар'ялямі. Няма і фляндаў, якіх не дастаўляе Белмэталяаб'яднаньне. Завод «Пралетары» (Гомель) дагэтуль ня выканаў заказу на чыгунныя часткі для вадаправоду.

Будаўніцтва заводу можа быць скончана за паўтара месяца, калі Будаб'яднаньне па-баявому возьмецца за выкананьне сваіх абавязацельстваў, а Белмэталяаб'яднаньне поўнасьцю выканае свае заказы.

Трэба зрабіць усё неабходнае для таго, каб увесьці ў строй адно з важнейшых прадпрыемстваў маладой савецкай хэмічнай прамысловасьці.

**Ф.**

## Без праектаў і чарцяжоў

Капітальнае будаўніцтва па прамысловасьці Наркамснабу БССР у гэтым годзе зацьверджана ў суме каля 20 млн. руб., але да апошняга часу рад новых аб'ектаў яшчэ ня мае поўных праектаў і плянаў.

Няма дагэтуль усіх праектаў і рабочых чарцяжоў будаўніцтва мылавараннага, гідра-генэзацыйнага заводаў у Гомелі і буйнага мясакамбінату ў Магілеве. Яшчэ не адведзен пават вучастак для будаўніцтва дадатковых цэхаў «Камунаркі».

Эканамічнае ўгрунтаваньне гэтых пабудоў даволі слабае; навукова-тэхнічны савет харчовай прамысловасьці прымаў у гэтай рабоце зусім нязначны ўдзел. На пасяджэньні гэтага савету былі разгледжаны толькі эканамічныя абгрунтаваньні праекту пабудовы гомельскага патачнага заводу.

Будаўнічая група прамсэктару Наркамснабу, на чале з тав. Зайцавым, не наладзіла, як сьлед, плянаваньня будаўнічых работ. Маслабойна-маргарынавае аб'яднаньне і Белмясапрамтрэст праявілі незацікаўленасьць гэтай справай, не мабілізавалі ўсіх рэсурсаў, каб разгарнуць будаўніцтва.

**Будаўнік.**

## Чаму затрымліваюцца капітальныя работы на Гомсельмашы

XIV зьезд КП(б)Б у сваёй пастанове аб рабоце прамысловасьці БССР з усёй выразнасьцю падкрэсьліў неабходнасьць фарсаваньня ў г. г. капітальнага будаўніцтва па заводзе Гомсельмаш.

Аднак, непаваротлівасьць заводакіраўніцтва і сэктару капітальнага будаўніцтва заводу не забясьпечваюць выкананьня заданьня ў тэрмін.

Плян будаўніцтва 1931 году выкананы толькі на 73 проц. Загадчык сэктару капітальнага будаўніцтва тав. **Скаблоў** тлумачыць марудныя тэмпы работ і ў гэтым годзе радам «незалежных» прычын (несваячасовы водапуск грошай, будматар'ялаў). Гэтыя тлумачэньні няправільныя, яны не адпавядаюць сапраўднасьці. Калі ў мінулым годзе на будаўніцтве адчуваўся значны недахват будматар'ялаў і абсталяваньня для паасобных цэхаў, дык зараз гэтыя перашкоды ліквідаваны. Завод у асноўным забясьпечан неабходнай колькасьцю матар'ялаў і абсталяваньня. Для сканчэньня будаўніцтва адпушчаны патрэбныя групы, якія поўнасьцю не выкарыстоўваюцца.

Пуск у эксплёатацыю мэханічнага цэху меркаваўся 5 мая г. г. Яшчэ трэцяга красавіка па гэтым пытаньні была склікана спэцыяльная парада, якая канстатавала, што ёсьць усе магчымасьці для выкананьня заданьня ў тэрмін. Белдзяржбуд узяў на сябе абавязацельства даць неабходныя матар'ялы для сканчэньня фундаманту. УЭА абавязалася забясьпечыць цэх мантажом. Завод «Пралетары» прыступіў да вырабу мадэляй скрынак электраправодкі. Вытворчы аддзел заводу Гомсельмаш пераключыўся на складаньне чарцяжоў для шківаў і валікаў. Аднак, тэмпы работ да апошняга часу вельмі павольныя і не забясьпечваюць пуску мэханічнага цэху ў бліжэйшыя тыдні. Галоўным чынам ві пават тут сэктар капітальнага будаўніцтва, які праяўляе поўную незацікаўленасьць фарсаваньнем будаўніцтва.

Трэба адзначыць нездавальняючую якасьць леташніх будаўнічых работ. У складзе гатовых вырабаў усе дзьверы пакасіліся і не зачыняюцца. Дах у гэтым-жа складзе працякае, з-за чаго іржавеюць каштоўныя машыны. Вэнтыляцыя ў ліцейным цэху працуе з вялікімі перабоямі. Са значнымі перабоямі працуюць сушылкі дрэваапрацоўчага цэху з прычыны дрэннага абсталяваньня іх. Не пабудавана халадзільная камэра, якую трэба было зрабіць у першую чаргу.

Аб усіх гэтых непаладках некалькі раз сыгналізавала заводзкая шматтыражка «Сельмашац», але заводакіраўніцтва не рэагавала па гэтыя сыгналы.

**Калектыўны рабкор «Зьвязды»—РЭДКАЛЕГІЯ ШМАТТЫРАЖКІ «СЕЛЬМАШАЦ».**

Рабочыя віцебскага панчошна-трыкатажнага камбінату імя «КІМ» т. т. ГОФМАН і ЛЫСЮК вынайшлі аўтамат для абточкі трыкатажных іголак, які заменіць работу 25 чал.

Пад іх кіраўніцтвам арганізаваны на камбінаце цэх для электра-зварні папсаваных імпартных іголак.

На ЗДЫМКАХ т. т. ЛЫСЮК і ГОФМАН—за работай, а таксама паасобныя моманты працы цэху.

# КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ ДЭПО ПРАЦЯГНУТ ДА 30 ЧЭРВЕНЯ

**16 мая адбылося пасяджэньне журы II усебеларускага конкурсу спараных брыгад імя XIV зьезду КП(б)Б.**

**Журы абгаварыла пытаньне аб прэміяваньні лепшага дэпо, начальніка дэпо, майстра, манцёра, дзяжурнага па дэпо, рамонтную брыгаду, дыспэтчара і раённую газэту.**

**Улічваючы, што за час конкурсу—адзін месяц і 20 дзён, аказалася немагчымым устанавіць сапраўднае лепшае дэпо, у мэтах найбольш правільнага вырашэньня пытаньня аб лепшым дэпо і іншых аб'ектах, намечаных да прэміяваньня, журы пастанавіла ПРАЦЯГНУЦЬ КОНКУРС ПА ГЭТЫХ АБ'ЕКТАХ ДА 30 ЧЭРВЕНЯ ЎКЛЮЧНА. Для выяўленьня становішча работы па гэтых аб'ектах ПАДЛІК БУДЗЕ ПРАВЕДЗЕН ЗА ЎСЕ 6 МЕСЯЦАЎ ПЕРШАГА ПАЎГОДЗЬДЗЯ 1932 ГОДУ.**

**Журы вылучыла спэцыяльную брыгаду для распрацоўкі канкрэтных форм уліку работы па гэтых аб'ектах. Будзе ўстаноўлена бальная сыстэма, якая па зацьвярджэньні журы будзе паведамлена ўсім дэпо Беларусі.**

**Журы прапанавала ўсім раёнам і дэпо неадкладна мабілізаваць шырокія масы транспартнікаў для далейшай барацьбы за здаровы паравоз, за бальшавіцкае выкананьне ўсіх вынярэльнікаў трансфінпляну.**

**ЖУРЫ 2-ГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА КОНКУРСУ СПАРАНЫХ БРЫГАД.**

## Мабілізацыяй дадатковых харчовых рэсурсаў палепшылі рабочае снабжэньне

**(Заводы «Беларусь» і імя Бэбэля)**

Трыкутнікі перадавых прадпрыемстваў харчовай прамысловасьці БССР правільна зразумелі дырэктыву кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) аб тым, што ў справе паляпшэньня рабочага снабжэньня асаблівае значэньне мае «разгортваньне ўсялякіх дапаможных прадпрыемстваў пры сталовых, фабрыках, заводах, каапэрацыйных арганізацыях для вышукваньня дадатковых харчовых рэсурсаў, а таксама разгортваньне самазагатовак»...

Заводы **«Беларусь»** і імя **Бэбэля** па цэнтралізаваным пляне снабжэньня ад несены да 2-га і 3-га сьпісаў. Таму барацьба за мабілізацыю мясцовых рэсурсаў шляхам арганізацыі дапаможных гаспадарак — сьвінаадкормачных пунктаў, самадзейных гародаў, разгортваньня самазагатовак набывае тут асабліва важнае значэньне.

Заводы «Беларусь» (Менск) і імя Бэбэля (Віцебск) па колькасьці рабочых—прадпрыемствы нябуйнага маштабу. Але яны даюць узоры таго, як трэба змагацца за дадатковыя харчовыя рэсурсы, за паляпшэньне рабочага снабжэньня.

Рабочыя заводу **«Беларусь»** ня скар дзяцца на сваю сталоўку. І ня дзіва. У сталоўцы чыста, няма чаргі. 25 дзён у месяц у мэню фігуруюць мясныя абеды коштам у 50 кап. У бліжэйшыя дні ўводзіцца водапуск сьнеданьняў. Сталоўка не адчувае недахвату, напрыклад, у такіх рэчах, як бульба.

Адкуль-жа сталоўка атрымлівае мяса? Вельмі проста. Крыніца мясных прадуктаў—сьвінаадкормачны пункт, на якім пастаўлена 49 сьвіней. Колькасьць іх павялічваецца да 100.

Сталоўка, аднак, гэтым не абмежавалася. Пры актыўнай дапамозе заводзкай грамадзкасьці арганізавана малочная гаспадарка на 20 кароў, што дае магчымасьць, акрамя задавальненьня патрэб грамадзкага харчаваньня, амаль штодзённа выдаваць ударнікам па літру малака за 20 кап.

У мінулым годзе заводзкі калектыў засеяў гарод на 18 гэкт. Гэтым самым удалося задаволіць рабочых гароднінай і, галоўным чынам, бульбай. Сёлета плошча пад гародам пашыраецца да 30 гэкт.

Пры заводзе арганізуецца трусятнік на 30 матак. Улічваючы арганізацыю трусятніка, пэўная плошча гароду засяваецца кармовымі культурамі.

На час сяўбы старшыня заўкому вызвален ад іншай работы, каб забясьпечыць кіраўніцтва і дапамогу ў правядзеньні сяўбы.

Самазагатоўкі ў балянсе сталовай займаюць 20-25 проц.

Сталоўка пры заводзе імя **Бэбэля** арганізавалася нядаўна, але і яна стала на правільны шлях вышукваньня дадатковых харчовых рэсурсаў для паляпшэньня рабочага снабжэньня.

На адкорме 30 сьвіней, што дае магчымасьць 26-27 раз у месяц даваць рабочым мясныя абеды коштам у 55 кап. Лік сьвіней павялічваецца да 60-70.

Заключан дагавор з прытарадным калгасам па апрацоўку часткі плошчы пад гародныя культуры для снабжэньня рабочых гароднінай.

Арганізуецца трусятнік на 30 матак. Сталоўка разгортвае самазагатоўкі. Загадчык яе, тав. **Скудэльскі**, стары рабочы, сакратар партячэйкі.

У выніку паляпшэньня рабочага снабжэньня цікучасьць рабсілы зьведзена да мізэрнага процанту.

Вопыт двух паказаных заводаў гаворыць аб тым, што пры мабілізацыі заводзкай грамадзкасьці і, галоўным чынам, пры бальшавіцкай настойлівасьці можна дабіцца вялізарных вынікаў у рэалізацыі адной з умоў тав Сталіна—аб паляпшэньні рабочага снабжэньня.

**М.**

На сьвінаадкормачным пункце Менскага ТСТ

**Е. Бутомаў і З. Левін**

# ХАРЧОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ У ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ

Харчовая прамысловасьць БССР за апошнія гады дасягнула вялікіх посьпехаў. З саматужнага, адсталага, раздробленага харчовага промыслу яна паступова ператвараецца ў буйную мэханізаваную індустрыю. За перыяд з 1928-29 г. па 1931 г. валавая прадукцыя павялічылася амаль у 6 раз. Рад галін харчовай прамысловасьці перавыканалі ўжо пляны першай пяцігодкі: кандытэрская прамысловасьць яшчэ ў 1931 г. выканала плян першай пяцігодкі на 305 проц., макаронная—на 103 проц.

Аднак, тэмпы росту асноўных галін харчовай прамысловасьці БССР (мяса, рыба, масла) далёка яшчэ не адпавядаюць тым запатрабаваньням, якія прад'яўляе рабочае спажыўнае.

Дырэктывы XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі прапануюць: «Усямерна разгарнуць вытворчасьць важнейшых галін прамысловасьці на базе стварэньня буйнай машыннай індустрыі і значнага разгортваньня сельска-гаспадарчай сырцовай базы, забясьпечыць патраеньне норм спажываньня, выходзячы пры гэтым з неабходнасьці шпаркага разьвіцьця лёгкай і харчовай прамысловасьці ў новых раёнах, а іменна ў раёнах вытворчасьці сельска-гаспадарчага сырцу».

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР ускладае на харчовую прамысловасьць адказнейшую задачу — «усямерна разьвіць пераапрацоўку сельска-гаспадарчай прадукцыі, у першую чаргу мясных і малочных прадуктаў, садавіны і гародніны, а таксама шырока разгарнуць кансэрвовую вытворчасьць для ўнутранога спажываньня БССР і для вывазу ў іншыя раёны СССР».

Задача гэта патрабуе стварэньня ўласнай сырцовай базы для харчовай прамысловасьці БССР, будаўніцтва на гэтай базе новых мэханізаваных і ўдасканаленых прадпрыемстваў і рэконструкцыі большасьці існуючых.

За апошнія гады, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, харчовая прамысловасьць заваявала значныя дасягненьні ў адносінах абнаўленьня свайго асноўнага капіталу.

За гэтыя гады пабудаваны буйнейшы Аршанскі мясакамбінат, Віцебскі маслазавод, рад кандытэрскіх фабрык, элеватары і г. д. У гэтым годзе канчаецца пабудова маргарынавага заводу і дзьвёх прудавых гаспадарак, пачынаецца будаўніцтва буйнейшага мясакамбінату ў Магілеве, гідра-генэзацыйнага і мылаваранага заводаў у Гомелі і г. д.

Выходзячы з неабходнасьці стварэньня ўласнай сырцовай базы па с.-г. сырцу, Наркамснаб БССР распрацаваў спэцыялістычны заказ НКЗ, які прадугледжвае буйнае павялічэньне пасеваў тэхнічных, гародных культур, гарчыцы, пашырэньне пасеваў цукровых буракоў у Брагінскім і Хойніцкім раёнах, разьвіцьцё культуры цыкорыя, які зьяўляецца сырцом для цукровай, броварнай і кава-сурагатнай прамысловасьці і г. д. Выраб гародных кансэрваў патрабуе ўзмоцненага разьвіцця бабовых і таматных культур. Поўнае задаваленьне патрэб Віцебскай махорачнай фабрыкі вострa ставіць пытаньне аб пашырэньні пасеву махоркі.

Арганізуючы ўплыў харчовай прамысловасьці на стварэньне сырцовай базы і яе спэцыялізацыю павінен вызначацца ў тым, што цэнтрам разьвіцьця тых ці іншых расьлінных культур або галін жывёлагадоўлі зьявяцца ў бліжэйшы час буйныя харчовыя камбінаты.

У галіне **мясной прамысловасьці** вызначана карэнным чынам рэканструяваць існуючыя мясакамбінаты. Мясаапрацоўчая прамысловасьць дагэтуль ня мае ўсяго патрэбнага абсталяваньня для поўнай пераапрацоўкі прадуктаў. Толькі тры камбінаты маюць больш-менш абсталяваныя пе-

атрымліваюцца ад убою. Асноўная маса бойняў не задавальняе нават мінімальных тэхнічных і санітарных патрабаваньняў, у большасьці іх няма каналізацыі і вадаправоду. Пры такім становішчы мясакамбінатаў толькі палова прадуктаў скарыстоўваецца па прызначэньні, прычым якасьць іх прадукцыі вельмі нізкая.

Убойны цэх Менскага мясакамбінату можа прапусьціць, напрыклад, толькі 350 шт. у суткі. Кішэчны цэх можа прапрацаваць ня больш чым 200-250 камплектаў.

У другой пяцігодцы Наркамснаб мяркуе ўзбудаваць Аршанскі мясакамбінат, давёўшы яго магутнасьць да 30 тыс. тон мясапрадуктаў у год, шырока эксплёатаваць новы вялікі Магілеўскі камбінат, магутнасьцю ў 100 тыс. тон мясапрадуктаў, а таксама пабудаваць новыя мясапрацоўчыя прадпрыемствы ў Гомелі, Менску, Віцебску і Бабруйску. Арыентовачны плян прадугледжвае таксама выпуск мясных камбінатамі звыш 20 млн. банак мяса-кансэрваў.

Зусім зразумела, што капіталаўкладаньні па лініі мясной прамысловасьці ў другой пяцігодцы зьяўляюцца вельмі значнымі і складаюць каля 20 проц. агульнай сумы ўсіх капітальных выдаткаў па харчовай прамысловасьці. Да канца другой пяцігодкі скарыстаньне жывой вагі жывёлы будзе даведзена да 85 проц. супроць 68 проц. у гэтым годзе.

**Малакоапрацоўчая прамысловасьць** БССР пачала разьвівацца толькі ў апошнія гады. У разгортваньні гэтай вытворчасьці дае сябе адчуваць спадчына прышчэпаўскай палітыкі, якая базавалася на тым, каб будаваць саматужныя масларобчыя заводы для абслугоўваньня ня буйных калектыўных гаспадарак, а кулака-хутаранна. На сёньняшні дзень па 75 раёнах БССР раськідана больш 700 заводаў, якія пераапрацоўваюць усяго толькі 135 [illegible]

тон на адзін завод. Паколькі гэтыя прадпрыемствы пабудаваны бяз уліку сырцовай базы, атрымалася, што па некаторых раёнах (Любаньскі) яны зусім бязьдзейнічаюць. Наступ з-за адсутнасьці ўліку сырцовай базы, малакоапрацоўчыя заводы загружаны ўсяго толькі на 50 проц.

Выходзячы з пэрспэктывы значнага павышэньня стада жывёлы да канца другой пяцігодкі, Наркамснаб праектуе давесьці пераапрацоўку малака ў 1937 г. да 1.400 тыс. тон. Будзе пабудован рад буйных мэханізаваных заводаў, магутнасьцю ў сярэднім у 100 тыс. тон малака кожны. Вызначана пабудаваць у Мазыры завод па выпрацоўцы сухога малака.

**Рыбная прамысловасьць** БССР адыгрывае зараз вялікую ролю ў галіне рабочага снабжэньня. Таму пляны другога пяцігодзьдзя прадугледжваюць значнае пашырэньне рыбнай гаспадаркі. Аднак, паколькі БССР зьяўляецца раёнам малога рыбацтва, дзе лоў з натуральных водаёмаў задавальне ўсяго толькі 5 проц. патрэбы ў рыбапрадуктах, дык найбольш актуальным пытаньнем зьяўляецца зараз **шпаркае разьвіцьцё штучных водазбораў** як па лініі Белрыбтрэсту, так па калгасах і саўтасах. Трэба адзначыць, што становішча прудовай гаспадаркі БССР нездавальняючае: 2.800 га гаспадаркі скарыстоўваецца вельмі дрэнна.

Пляны другой пяцігодкі прадугледжваюць інтэнсыфікацыю вазёрнай гаспадаркі і значнае разьвіцьцё штучных водаёмаў, якія зараз знаходзяцца амаль у пачатковым стане.

Вялікую ўдзельную вагу ў харчовай прамысловасьці мае **плодагародная вытворчасьць.** У плянах разьвіцьця харчовай індустрыі галоўная ўвага аддана пераапрацоўцы плодагароднінаў і яе кансэрваваньню. У гэтым годзе будзе перададзены ў эксплёатацыю Магілеўскі завод па сушцы плодагароднінаў прадукцыі. Намечана пабудаваць яшчэ 5 такіх сушыльных заводаў.

Наяўнасьць у БССР дзікарастучых журавін дае падставу запраектаваць пабудову 3-х журавіна-экстрактных [illegible]

кожны. Журавінны экстракт зьяўляецца ня толькі каштоўным харчовым прадуктам, але і вельмі добрым мэдычным сродкам.

Намечана пабудаваць у Калінкавічах буйную мэханізаваную грыбную фабрыку, на якой будуць вырабляцца высокаякасныя кансэрвы, якія маюць вялікі збыт на замежным рынку. Апорай гэтай фабрыкі будзе служыць раёніраваная сетка пунктаў па перапрацоўцы грыбоў у радзе раёнаў БССР.

Намячаецца таксама стварыць рад заводаў па выпрацоўцы яблучнага пюрэ і ягадных поўфабрыкатаў з ягад, прадпрыемствы па засолцы, квашэньні капусты, гуркоў і іншых відаў гароднінны.

Новым тыпам харчовых прадпрыемстваў ва ўмовах БССР зьявяцца кансэрвовыя камбінаваныя заводы, якіх мяркуецца пабудаваць каля 4 (у Рагачове і іншых мясцох). Яны разьлічаны на пераапрацоўку розных гароднінны (галоўным чынам бабовых расьлін, а таксама тамату), мяса (сьвініны), пладоў і ягад.

Вялікі размах атрымае вытворчасьць пладовых і ягадных він, сокаў і канцэнтратаў. Усяго за пяцігодку арыентовачна мяркуецца ўкласьці ў плодагародную прамысловасьць да 11-12 млн. руб.

Новыя заводы зьявяцца магутным фактарам разгортваньня буйнага прамысловага гароднінства ў калгасах і саўтасах, укараненьня культур новых каштоўных відаў гароднінны, як шпінат, спаржа, памідоры, садовы гарошак і інш.

На базе разгортваньня **птушніцтва** мяркуецца значна пашырыць пераапрацоўку птушкапрадуктаў. Намечана значна мэханізаваць і пашырыць Жлобінскі птушніцкі камбінат да яго праектнай магутнасьці (4.000 тон забітай птушкі), поўнасьцю рэканструяваць Полацкі камбінат, пабудаваць новы яйка-птушны камбінат, спэцыялізаваны на разьвядзеньні (інкубацыі) і забоі качак.

Асабліва значэньне набывае разьвіцьцё [illegible]

ўмовы БССР спрыяюць разьвядзеньню гэтага даходнага і эфэктыўнага віду хатняй птушкі.

**Патачная прамысловасьць** павінна задаволіць у асноўным патрабаваньні кандытэрскай прамысловасьці БССР. У сувязі з гэтым праектуецца пабудова ў Рагачове патачнага заводу, магутнасьцю ў 13.000 тон патакі ў год. Апрача таго, будуць працаваць гомельскі і менскі заводы. Усе яны павінны абслугоўвацца прымацаванымі да іх крухмальна-пёрачнымі заводамі. Дробныя саматужныя патачныя заводы, якія працуюць дзедаўскімі спосабамі, трэба ліквідаваць. Сканцэнтраванай—кандытэрскай прамысловасьці павінна адпавядаць сканцэнтраваная мэханізаваная патачная вытворчасьць.

Новым відам бульбапераапрацоўкі зьявіцца **сагавая прамысловасьць.** Арыентовачна вызначана пабудаваць тры заводы штучнага сага магутнасьцю ў 2,5 тыс. тон прадукцыі кожны.

**Кандытэрская прамысловасьць** БССР павінна ў асноўным грунтавацца на пераапрацоўцы мясцовага сырцу — пладоў і ягад. У сувязі з гэтым намечана стварыць дзьве новыя мармэляднныя фабрыкі ў Магілеве і Менску, магутнасьцю ў 10.000 тон прадукцыі кожная, адначасова пашырыць бабруйскую мармэляднную фабрыку.

Існуючыя чыста кандытэрскія прадпрыемствы (Гомель, Менск, Нароўля) намячаецца мэханізаваць у яшчэ большай меры з тым, каб давесьці іх магутнасьць да 30.000 тон у год. У Менску павінен быць пабудован бісквітны цэх на кандытэрскай фабрыцы «Камунарка». Будзе пабудавана таксама бісквітная фабрыка ў Воршы.

Паводле арыентовачных намячэньняў, у другой пяцігодцы будуць створаны 1 буракова-цукровы завод і буйная макаронная фабрыка.

Вялізарнае разгортваньне насеваў тэхнічных культур стварае вялікія пэрспэктывы для разьвіцьця **маслабойнай прамысловасьці.** На працягу 5 год вызначана пабудаваць адзін завод спэцыялізаваны на пераапрацоўцы кана[illegible]

кі завод па выпрацоўцы ільнянога мала на 20 прэсаў у Магілеве. Віцебск завод мяркуецца пашырыць да 1[illegible] прэсаў, а таксама максімальна павялічыць магутнасьць бабруйскай алейні.

Да канца другой пяцігодкі ў Гомелі будзе створан магутны тлушчавы камбінат з маргарынавага, гідрагенізацыйнага і мылаваранага заводаў.

Папярэднія разьлікі паказваюць, што БССР да канца другой пяцігодкі зможа поўнасьцю задаволіць уласным рэсурсамі свае патрэбы ў жыце і іншых збожжавых культурах. Таварныя млыны, якія зараз працуюць, маюць вельмі нязначную памольную плошчу. Таму на працягу другой пяцігодкі мяркуецца пабудаваць рад млыноў і элеватараў, рэканструяваць існуючыя крупарушныя фабрыкі, пабудаваць новыя прадпрыемствы [illegible] вырабу грэчневай крупы, лушчанага гароху і г. д. За пяцігодку арыентовачна будзе ўкладзена ў мукамольна крупяную прамысловасьць звыш 1[illegible] мільёнаў рублёў.

Агульная сума капіталаўкладаньняў у харчовую прамысловасьць будзе складаць да 200 млн. руб.

**Валавая прадукцыя харчовай прамысловасьці да канца другой пяцігодкі павінна павялічыцца ў 10 раз супроць 1932 г.**

Трэба адзначыць, што ў пяцігадовым пляне, распрацаваным Наркамснабам БССР, няма праблемы пераапрацоўкі аднаго з важнейшых мясных прадуктаў—мясатрусоў і пераапрацоўкі розных адыходаў харчовай прамысловасьці.

На ўсе галіны харчовай прамысловасьці Наркамснабу БССР мелі пляны на першую пяцігодку. Толькі на кандытэрскай, броварнай і маслабойнай прамысловасьці былі распрацаваны пяцігадовыя пляны. Гэта яшчэ боль

# ШЫРОКІЯ ПЛЯНЫ ЯПОНІІ Ў МАНЧЖУРЫІ

ШАНХАЙ. Яшчэ не пасьпелі заціхнуць дэкларацыі японскіх імпэрыялістаў наконт таго, што яны ня маюць ніякіх захопніцкіх намераў у адносінах Манчжурыі, як у японскім друку ўжо зьяўляюцца яўна ісьпіраваныя артыкулы, якія адкрыта настойваюць **на ўключэньні Манчжурыі ў склад японскай імпэрыі.** Гэтаму пытаньню прысьвечан рад артыкулаў, між іншым, і ў часопісі «Транс-пасіфік», якая выдаецца ў Токіё на ангельскай мове.

Аўтары праекту канчатковага патлыненьня Манчжурыі даказваюць неабходнасьць «аб'яднаньня Японіі, Карэі і Манчжурыі ў самастойны эканамічны блёк накшталт Брытанскай імпэрыі».

З самага пачатку ўварваньня японскіх войск у Манчжурыю ясна было, што справа ішла іменна аб захопе гэтай вялізарнай тэрыторыі, аб яе адарваньні ад Кітаю. Гэта, аднак, не перашкаджае названай часопісі паказваць справу так, як быццам гэта думка зьявілася ў японскіх імпэрыялістаў толькі ў працэсе разьвіцьця падзей.

«Спачатку,—чытаем мы там,—ня было другога намеру, акрамя абароны жыцьця, уласнасьці і дагавароў. Думка аб аб'яднаньні Японіі, Карэі і Манчжурыі ў адзін эканамічны блёк..., бадай, нарадзілася на працягу апошніх пяці месяцаў, умацаваўшыся часткова з прычыны ілпрыязнай пазыцыі, якую заняў сьвет».

Паводле слоў аўтара, з часу рускаяпонскай вайны Японія тры разы мела выпадак ажыцьцявіць свае пляны. Першы выпадак прадстаўляецца некалькі год пасьля гэтай вайны. Другі раз гэта магло быць зроблена ў часе сусьветнай вайны, або адразу-ж пасьля яе скончэньня. Нарэшце, трэці выпадак прадстаўляецца ў сучасны момант. Аўтар шкадуе, што японскія імпэрыялісты схапіліся за розум «са спазьненьнем».

«Кітай,—заяўляе ён,—меў у сваім распараджэньні дзесяць год для пасаджэньня антыяпонскага выхаваньня. Палітыка Амэрыкі прыняла больш або менш пэўную форму. Былі падпісаны дагавор дзевяці дзяржаў і пакт Кэлёга. Як яны (дагавор і пакт) дрэнна ня былі прыстасаваны да рэальнай абстаноўкі ў Кітаі, аднак, яны аказвалі ўплыў на сусьветную грамадзкую думку. Японіі прышлося ўхапіцца за гэты апошні выпадак, сустракаючы самую рэзкую крытыку з боку ўсяго сьвету. Але іменна гэта рэзкасьць паказала японцам, бо нішто іншае не магло бы гэтага зрабіць, што гэта апошні выпадак, які яны ня могуць дазволіць сабе ўпусьціць. Няпрыязная рэакцыя з боку ўсяго сьвету толькі ўмацоўвае гэта пачуцьцё. Чым мацней крытыка, тым больш цьвёрдая рашучасьць Японіі».

Інакш гаворачы, усё тлумачыцца тым, што захапіць Манчжурыю да гэтага часу па тых ці іншых прычынах не ўдавалася. Цяпер-жа міжнародная абстаноўка, якая склалася, як мяркуюць кіруючыя дзеячы імпэрыялістычнай Японіі, спрыяе ажыцьцяўленьню даўно жаданых імі захопніцкіх плянаў.

У якасьці аднаго са спосабаў «асваеньня» Манчжурыі высоўваецца ператварэньне яе ў «індустрыяльны працяг Японіі», якое суправаджаецца масавай японскай калёнізацыяй.

«Манчжурыя, — заяўляе аўтар, — можа быць утрымана назаўсёды пад японскім уплывам толькі гэтым шляхам».

На масавым перасяленьні японцаў у Манчжурыю асабліва настойвае японская ваенная кліка. Адпаведны плян ўжо распрацован міністэрствам калёній. **Ён прадугледжвае перасяленьне ў Манчжурыю паўмільёна японцаў на працягу 10 год. На гэту справу патрабуецца вялізарная сума — 200 млн. іен, якую мяркуецца затрацiць у выглядзе авансу перасяленцам з разьліку 2.000 іен на сям'ю ў 5 чалавек.**

(«Кр. З.»).

## Канфлікт паміж камісіяй Літона і манчжурскім урадам

ТОКІЁ, 17. Паводле паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнго з Чанчуня, тут прадбачаць новы канфлікт паміж камісіяй Літона і манчжурскім урадам. У сувязі з тым, што **камісія настойвае на спатканьні з генэралам Ма,** манчжурскі ўрад заявіў, што ён ня толькі не акажа ніякай садзейнасьці тэтаму спатканьню, але катэгарычна пярэчыць супроць яго. Манчжурскі ўрад апублікаваў афіцыяльную заяву, у якой ён адхіляе просьбу камісіі аб наладжаньні сустрэчы. Паводле паведамленьня таго-ж агенцтва з Харбіну, манчжурскія ўлады надзвычай абураны паводзінамі кітайскага дэлегата, які суправаджаў камісію Вэлінгтона Ку, і абмяркоўваюць пытаньне аб яго арышце ў выпадку, калі ён «ня зьменіць сваіх паводзін». Агенцтва ўказвае, што «манчжурскія ўлады асабліва абураны тым, што члены камісіі Лігі нацый у радзе выпадкаў, як відаць, прынялі прапанову Вэлінгтона Ку аб парадку і мэтадах вывучэньня Манчжурыі».

# ПАДРАБЯЗНАСЬЦІ ДОПЫТУ ГАРГУЛАВА

ПАРЫЖ, 19. Парыскі штотыдневік **«Вю»** публікуе расказ свайго карэспандэнта, які асабіста прысутнічаў пры першым допыце Гаргулава ў паліцыі зараз-жа пасьля замаху. Карэспандэнт расказвае, што пры зьяўленьні журналістаў «паліцэйскі камісар яўным чынам страціў галаву, бо кожную хвіліну падскакваў да тэлефону для данясеньняў свайму начальству, спадзяючыся, што ўсё гэта прынясе яму аднакі і засьведчыць яго спакой і вытрыманасьць». Аднак, чыноўніку так і не ўдалося папярэдзіць уварваньне цэлага натоўпу журналістаў, якія зьявіліся з усіх рэдакцый. Ад шэфа крымінальнай паліцыі Гішара, паліцэйскі камісар атрымаў за гэта вымову.

На першым допыце Гаргулаў заявіў: «Мяне завуць Паўлам Гаргулавым, я нарадзіўся ў станіцы Лабінскай на Каўказе. Па пераконаньні я —ідэаліст. Па скончэньні Праскага унівэрсытэту атрымаў дыплём доктара мэдыцыны. Я не манархіст, але зьяўляюся старшынёй нацыянальна-рэспубліканскай дэмакратычнай фашысцкай партыі».

**Начальнік паліцыі:** «Вы дэмакрат? Гэта ня тое самае што камуніст?»

**Гаргулаў:** «Не, ніколі. **Я ненавіджу камуністаў і сацыялістаў, бо яны зьнішчылі маю бацькаўшчыну».**

Тут карэспандэнт «Вю» заўважвае: «дырэктар паліцыі яўна засмучан гэтай заявай».

Далей Гаргулава спыталіся, што прымусіла яго страляць у Думэра.

**Гаргулаў:** «Я зрабіў гэта таму, што Францыя падтрымлівае бальшавіцкі ўрад і тым самым сярэдзе лагібелі маёй бацькаўшчыны». Пры гэтых словах, — піша карэспандэнт «Вю», — сярод прысутных раздаюцца воклічы зьдзіўленьня, але начальнік паліцыі не сьмяецца і жароткім гестам перарывае допыт. Калі допыт аднаўляецца, ў ім прымае ўдзел разам з начальнікам паліцыі і суддзяя следчы. Яны дапытваюць Гаргулава аб кольгасным і асабістым складзе палітычнай арганізацыі, якой кіруе Гаргулаў.

**Гаргулаў адказвае:** «Я стварыў сваю партыю ў 1927 годзе ў Прэзэ і ў ёй ніколі ня было больш 30 ці 40 членаў па ўсёй Эўропе. Што датычыць тых з маіх, якія знаходзіліся ў Парыжы, дык яны выдалі мяне паліцыі, у якой яны знаходзіліся на службе ў якасьці правакатараў і шпіёнаў». Пры гэтых словах адзін з прысутных чыноўнікаў «Сюртэ Жэнэрал» (ахранкі) рэзка абрывае Гаргулава: «Не гаварэце глупстваў. У французкай паліцыі німат іншых спраў, апрача мітусьні з вамі». Карэспандэнт «Вю» дадае з повазу гэтага: «Высокая пасадавая асоба з «Сюртэ Жэнэрал» (ахранка) вельмі энэргічна сказала гэтыя апошнія словы для таго, каб адным ударам зьнішчыць эфэкт апалягамлянчага цьвярджэньня Гаргулава, але фантам змоўкла, бо адчула вакол сябе шматлікіх выдатных дзеячоў, якія могуць гэта ацаніць так, што паліцыя можа быць фінраўды зацкана маха займалася Гаргулавым».

На прапанову судзьдзі-следчага расказаць аб сваіх прынцыпах, Гаргулаў адказвае: «Я адчуваю вялікую прыязнь да французскіх нацыяналістаў. Паважаю Мусаліні і Гітлера, але **ненавіджу камуністаў і сацыялістаў».**

Карэспандэнт «Вю» заўважвае пры гэтым, якой злоснай трымасай сказаюцца твары прысутнага начальства. Гэты суб'ект вельмі няпрыемны. Ён паўтараецца і «кликушэствуе», хутчэй нервавецем гутарку на іншую тэму. Пасьля некалькіх прызначных пытаньняў, Гаргулава пытаюцца: «Але чаму-ж, нарэшце, вы выбралі Думэра ў якасьці сваёй ахвяры?»

**Адказ:** «Я нічога ня маю супроць Думэра, **але забіваючы яго, я хацеў нанесьці ўдар Францыі і гэтым выклікаць вайну супроць бальшавізму. Я даўно хацеў яго забіць.** Цяпер, сказаўшы ўсю праўду, я магу памерці за бацькаўшчыну».

Карэспандэнт «Вю» заканчвае свой расказ наступнай характорнай рысай: «Гэта ўжо занадта. У гэты-ж час зьяўляецца пракурор рэспублікі, кідае шпаркі ўзрок на прысутных і ветліва просіць журналістаў выйсьці». (ТАСС)

## Белабандыт Гаргулаў--заядлы контр-рэвалюцыянэр

СЬВЯРДЛОЎСК, 18. У нумары **«Уральского рабочего»** за 18 мая апублікован артыкул былога палітычнага камісара кастрамскога, а таксама паўлаградзкага рэвалюцыйных атрадаў, зараз навуковага сакратара ўральскага філіялу Акадэміі Навук **А. Федзіна.** У студзені 1918 году Федзін па даручэньні новарасійскага камітэту бальшавікоў фармаваў атрады чырвонай гвардыі ў былой Лабінскай, а таксама Майкопскай акругах, узьнімаў барацьбу з карнілаўшчынай. Пасьля разгрому карнілаўшчыны некаторым часьцям карнілаўцаў удалося прабрацца ў горы, галоўным чынам у былую Майкопскую акругу.

З надыходам вясны з раду станіц пачалі паступаць трывожныя весткі аб выступленьні, якое рыхтуецца супроць саветаў. Адным з першых выступілі белагвардзейцы станіцы Лабінскай. У гэтым выступленьні прымаў удзел Паўла Гаргулаў разам са сваім бацькам. Паўла Гаргулаў быў бліжэйшым паплечнікам палкоўніка Жукава, аднаго з галоўных кіраўнікоў паўстаньня. «У задушэньні гэтага паўстаньня, — расказвае Федзін,—прымаў удзел наш кастрамскі атрад. Пры заняцьці станіцы Яраслаўскай нам удалося захапіць у ліку абаронцаў 6 чал. Гаргулаву ўдалося ўцячы. У хуткім часе высьветлілася, што Гаргулаў дзейнічае ў атрадзе генэрала Шкуро».

Федзін абвяргае панава выдуманую белагвардзейцам Астахавым вэрсію аб тым, што Паўла Гаргулаў быў нібы забіт 13 сакавіка 1918 г. у станіцы Калускай і што забойца Думэра, які назваў сябе Гаргулавым, зьяўляецца нібы Залатаровым — «былым бальшавіцкім камісарам». Федзін паведамляе факт аб тым, што ў маі 1918 году Гаргулаў пагражаў доктару больніцы станіцы Лабінскай -- Амэрыкаву адпомсьціць за абслугоўваньне параненых чырвонагвардзейцаў. Гэты факт гаворыць аб тым, што ў сакавіку Гаргулаў ня быў забіты. Што-ж датычыць Аляксея Залатарова, аб якім Астахаў гаворыць, як аб сапраўдным забойцы Думэра, дык аб ім Федзін паведамляе: Аляксей Залатароў, як белабандыт, быў расстрэлян у Краснадары ў хуткім часе пасьля ліквідацыі банды Карнілава. Наогул бандыцкая гісторыя залатароўшчыны пырока вядома кубанскаму насельніцтву.

Федзін устанаўлівае таксама асобу аўтара гэтай вэрсіі — Івана Астахава, які жыў у адным з бліжэйшых да Лабінскай станіц. Гэта—вядомы прапойца, бадзяга, які прамышляў барацьбой у цырку, кражамі, пагромамі. Усіх гэтых белабандытаў, — заканчвае Федзін, — ведаюць тысячы працоўных Кубані, як заядлых ворагаў савецкай улады, арганізатараў белабандыцкіх паўстаньняў, катаў працоўнага насельніцтва Кубані.

# *У фашысцкай Польшчы*

## Рабочыя Верхняй Сілезіі змагаюцца супроць „бястэрміновых водпускаў"

ВАРШАВА, 20. У Польшчы побач з простым скарачэньнем рабочых капіталісты карыстаюцца арыгінальным мэтадам **«бястэрміновых прымусовых водпускаў».** Гэты «мэтад» тым выгадны для ўладаў, што ён **утойвае** сапраўдныя разьмеры беспрацоўя. Рабочы, адпушчаны ў такі «бястэрміновы водпуск» і ня ведаючы, калі гэты «водпуск» скончыцца — **ня ліньцца беспрацоўным.**

Мэтад «бястэрміновых водпускаў» стаў чыста любімым мэтадам польскіх капіталістаў і здабыў сярод працэтарыяту сумнасьлівую **«славу».**

На дзіх у верхня-сілескай капальні **«Белы Шарлей»** капіталіст сумесна з урадавым камісарам пастанавілі адпусьціць у «бястэрміновы водпуск» **750 гарнякоў.** Абураныя рабочыя абвясьцілі салідарную забастоўку ў абарону таварышоў.

### Дружная барацьба прынесла сялянам перамогу

ВАРШАВА, 20. Гэтымі днямі адбылася забастоўка сялян **у Мінску-Мазавецкім,** якая заключалася ў байкатаваньні рынку з прычыны вялікіх падаткаў, вызначаных уладай за ўезд у горад. Сялянская забастоўка прахадзіла салідарна і адзначалася вялікай арганізаванасьцю.

**У выніку дружнай барацьбы сяляне перамаглі. Улада прымушана была зьнізіць падаткі за ўезд на 30 процантаў.**

Прыклад сялян **Мінска-Мазавецкага** павету акажаўся вельмі прывабным узорам. Прэса паведамляе, што такая-ж забастоўка выбухнула ў **Ловічы.** Прычыны — аналягічныя.

## Харчуюцца крапівой

ВІЛЬНЯ, 20. Голад, які зараз панае ў вёсцы Заходняй Беларусі, прымушае вілейскую буржуазную прэсу ўсіх напрамкаў **біць трывогу.**

Паменічыцкае **«Слово»,** аналізуючы сітуацыю вёскі, піша: «Цяпер жыта і хлеб падаражалі. Прычына гэтага павышэньня цэн у тым, што **хлеба няма. Сяляне ня маюць нават бульбы і харчуюцца маладой крапівой.** Жывёла ледзь трымаецца на нагах. Яна даўно блукае па лясох, бо корму няма і на лякарства».

Па Заходняй Беларусі ходзіць хвалі баявых сялянскіх выступленьняў. Напярэдкор абвяшчае пану да апошніх граніц тэрору, **сяляне масава горнуцца пад сьцягі КПЗБ,** бачачы ў рэвалюцыйнай барацьбе адзіны выхад з тупіку, у які іх прыняла авантурніцкая палітыка акупантаў.

Гэта, іменна, трывожыць акупантаў і прымушае іх газэтных лёкаеў біць трывогу.

# *Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі*

## Савецкі нікель

**СЬВЯРДЛОЎСК. 17 мая ў 12 гадзін дня на дугавой электрапечы Уралмашбуду УПЯРШЫНЮ Ў САЮЗЕ ЗРОБЛЕНА ПЛАЎКА НІКЕЛЮ. Атрымана 192 кгр. мэталю з наяўнасьцю чыстага нікелю 92 проц.**

**Першая плаўка нікелю праводзілася пад кіраўніцтвам групы работнікаў інстытуту каляровых мэталяў, на чале з праф. КУСАКІНЫМ.**

## Нафтавыя крыніцы на Урале

СЬВЯРДЛОЎСК. 16 мая з буравой № 702 на глыбіні 680 мэтраў у часе выпрабаваньня ўдарыў нафтавы фантан. На працягу 4-х гадзін фантан выкінуў 50 тон нафты. Адначасова з буравой № 703 трэці дзень працягваюцца парыядычныя фантанныя выкіды нафты. Плошча вакол абодвых буравых заліта нафтаю. Прыгатаваныя загадзя чаны і ямы для прыёму нафты перапоўнены.

## Выпрабаваньне трэцяга катла Магнітагорскага ДРЭС прайшло з посьпехам

МАГНІТАГОРСК. **Гідраўлічнае выпрабаваньне самага магутнага ў Саюзе трэцяга катла Магнітагорскай ДРЭС прайшло бліскуча.** Кацёл прызнан камісіяй прыгодным. Прыступлена да агнятрывалай кладкі. Гераічныя тэмпы і добрую якасьць мантажу паказалі камсамольскія брыгады мантажнікаў **Дзьмітрыева і Мацьвеева. Красавіцкі плян мантажу выканан на 118 проц.**

Адначасова праходзіць мантаж 50-тысячнай турбіны.

Тав. МАІСЕЕНКА—цесьляр дрэваапрацоўчага цэху заводу імя Ланцуцкага (Гомель). Даў шэраг каштоўных прапаноў, рэалізацыя якіх прынесла тысячы рублёў эканоміі

## Пэнзенскі вэлёзавод выпусьціў першы мэтр ланцуга Гальля

Пэнзенскі вэлёзавод 16 мая ў 11 гадз. 30 мін. выпусьціў першы мэтр ланцуга Гальля, асвоіўшы ўпяршыню ў Савецкім саюзе выраб ланцугоў.

Буйная перамога рабочых і ІТР вэлёзаводу вызвалае Савецкі саюз ад імпарту ланцугоў Гальля і захоўвае мільёны залатых рублёў.

### Сельгасмашыны

Віцебскі завод **«Чырвоны мэталіст» за 16 мая** выпусьціў тры балотныя плугі, што складае **176,4 проц.** сутачнага заданьня, 22 корнярэзкі—**105,7 проц.** заданьня, 17 макухадрабілак — **101,8 проц.,** 25 бульбакапалак — **85,6 проц.** і 4 бораны «Зіг-заг».

**18 мая** выпушчана 21 макухадрабілка, што складае **125,7 проц.** заданьня, 2 балотныя плугі, — **117,7 проц.,** 22 корнярэзкі — **105,7 проц.,** 26 бульбакапалак — **89. проц.** і 10 боран «Зіг-заг».

### Будматар'ялы

**Завод «інтэрнацыянал»** за трэцюю пяцідзеньку мая выпусьціў 3.414 кгр. шрубаў, што складае 94,3 проц. пляну.

***

За 17 мая завод **«Чырвоны Кастрычнік»** вырабіў 4.440 кгр. будаўнічых цьвікоў, што складае 64,6 проц. сутачнага заданьня.

***

**Камбінат «Камінтэрн»** за 17 мая расьпілаваў 151,3 кбм. сырцу — 74,5 проц. пляну.

### На 1-й БелДРЭС

За 15 мая на першай БелДРЭС выпрацавана 154.000 квт.-гадзін электраэнэргіі, што складае **84,4 проц.** сутачнага заданьня. Максымум дасягнуў 8.000 квт., мінімум—5.300 квт. і сярэдняе — 6.415 квт.

За 16 мая выпрацавана 157.000 квт.-гадзін электраэнэргіі, што складае **86,7 проц.** заданьня. Максымум дасягнуў 8.500 квт., мінімум — 5.400 квт., сярэдняе—6.540 квт.

Аварый і разгрузак за 15 і 16 мая ня было.

### Папера

За **17 мая на папяровай фабрыцы «Спартак»** выраблена 15 тон паперы, што складае 87,9 проц. сутачнага заданьня. У параўнаньні з 15 мая, процант выканаьня пляну павялічыўся на 3,6. Прастой машын—9 гадзін.

### Скура і абутак

**Гомельская абутковая фабрыка «Праца»** за 15 і 16 мая выпусьціла абутку хлапчуковага (яловага) 2.614 пар, што складае **248,9 проц.** заданьня, ботаў 2.465 пар — **115,7 проц.** заданьня, абутку хлапчуковага (вырасту) 758 пар — 65,9 проц. і абутку мужчынскага 484 пары — 22,5 проц. заданьня.

Усяго за два дні выпушчана 6.321 пара абутку.

### Вопратка

**Гомельская швэйная фабрыка «Камінтэрн»** за трэцюю пяцідзеньку мая выканала плянавае заданьне на **102,9 проц.**

Выпушчана піджакоў розных 9.149, штаноў — 15.588, таўстовак баваўняных — 18, кашуль юнгштурмаўскіх — 2.679 і кэпі розных — 13.340. Усяго выпушчана прадукцыі на 246.150 руб.

### Розныя вырабы

Віцебская **дзяржаўная голкавая фабрыка** за трэцюю пяцідзеньку мая дала прадукцыі на 28.943 руб., што складае **117,4 проц. пляну.**

***

За трэцюю пяцідзеньку мая **віцебская акулярная фабрыка** выпусьціла прадукцыі на 97.679 руб., што складае **105,9 проц. пляну.**

## Штогодняя прэмія імя М. Н. Пакроўскага за лепшую навуковую працу

**Беларуская Акадэмія Навук** вызначыла штогоднюю прэмію імя М. Н. ПАКРОЎСКАГА ў сумме 5.000 руб. за лепшую навукова-дасьледчую працу ў галіне грамадзкіх і прыродазнаўчых навук, напісаную навуковымі працаўнікамі БССР.

Для ўстанаўленьня навуковасьці працы створаецца пры БАН камісія ў складзе членаў прэзыдыуму БАН, прадстаўніка ЦБ сэкцыі навуковых работнікаў і прадстаўніка ДВС.

Першая прэмія будзе выдана ў 1933 годзе, у маі месяцы, за працы, напісаныя ў 1932 годзе.

# ТАВ. МОЛАТАЎ У БЯРЭЗЬНІКАХ

БЯРЭЗЬНІКІ, 19. Учора з Пермі прыбыў у Бярэзьнікі **т. Молатаў.** На працягу некалькіх гадзін тав. Молатаў знаёміўся са станам заводаў камбінату, імя [illegible]зяцца ў мантажы і ўжо прап[illegible], і са становішчам будаўніцтва другой чаргі камбінату. Пасьля азнаямленьня з хэмкамбінатам тав. Молатаў выехаў у Салікамск для агляду першай у Саюзе калійнай рудні, дзе таксама падрабязна азнаёміўся з ходам будаўніцтва рудні і мантажом мэханізмаў. Тав. Молатаў спускаўся ў капальню.

Вечарам тав. Молатаў спатканы бурнай авацыяй выступіў у Бярэзьніках на зьлёце ўдарнікаў камбінату з вялікай прамовай аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР, перадаўшы ў пачатку сваёй прамовы рабочым камбінату прывітаньне ад імя ЦК партыі і ўраду.

Прыезд **тав. Молатава** ўсюды адзначан арганізацыяй дзесяткаў новых ударных брыгад. На аднэй толькі ТЭЦ Бярэзьнікхэмбуду арганізавана 5 ударных брыгад з ахопам звыш 120 рабочых, пераводам брыгад на гаспадарчы разрахунак, перадачай лепшых ударнікаў у партыю, стварэньнем фондаў рацыяналізатарскіх прапаноў імя тав. Молатава, высоўваньнем сустрэчных плянаў па выкананьні вытворчых праграм, па разгортваньні новых вытворчасьцяй і па скарачэньні тэрмінаў мантажу.

Паводле пастановы рабочых першай і самай магутнай у Саюзе цэпла-электрацэнтралі надана імя тав. Молатава. Ударнікі ТЭЦ у рапарце тав. Молатаву абавязаліся ў самы кароткі тэрмін ператварыць ТЭЦ з вузкага месца заводу ў вядучае галоўнае прадпрыемства камбінату. У дзень прыезду тав. Молатава на камбінаце атрымана новая перамога. **Аміячны завод уступіў у работу на поўную магутнасьць.**

## Сустрэча тав. Постышава на Днепрабудзе

КІЧКАС, 19. На Днепрабуд прыехаў сакратар ЦК УсеКП(б) **тав. Постышаў.** На вакзале яго сустрэлі прадстаўнікі мясцовых савецкіх партыйных і прафэсыянальных арганізацый. На працягу дня тав. Постышаў аглядаў вучасткі будаўніцтва, азнаёміўся з ходам работ на ДРЭС і прамкамбінаце.

## Паведамленьні

— Культкроп ЦК КП(б)Б прапануе зьявіцца 21-V, у 2 гадз., у пакой 51 наступным т.т.: Кулс (ЦВК), Масевіч (БАН), Ларычаў (НКА), Фрадзін (Гарком), Сецько (БАН), Ошарава (БАН), Любін (завочны камвуз), Жукаў (БІМЗО), Рагінская (БАН), Рэзьнікаў (Гарвом).

22 мая, у 7 гадз. веч., у 23-м пакоі кансультацыя для прапагандыстаў усёй сеткі партасьветы: «Пастанова СНК і ЦК аб збожжа і жывёлазагатоўках і закон аб сельска-гаспадарчым падатку». Кансультант **Варушыла (НКФ).**

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

*Рэдакцыя газэты „Зьвязда" і ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня склікаюць на 22 мая ў 7 гадз. вечара*

## Нараду загадчыкаў сталовых г. Менску па пытаньні аб трусагадоўлі

**Нарада заслухае даклад дырэктара Менскага трэсту грамадзкага харчаваньня т. Турэцкага аб вызначаных у гэтай галіне мерапрыемствах і абгаворыць практычныя пытаньні трусагадоўлі пры сталоўках.**

**На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі сталовых: ЖАКТУ № 6—тав. ЛЮСТЭРНІК і аматар - трусавод БУГАЕВА, з БЕЛКААПСАЮЗУ—спэцыяліст ВІНАГРАДАЎ, з БЕЛТРУСАВОД-ТРЭСТУ — т. ГАЛУБЧЫК, з КАЛГАСЦЭНТРУ — т. БАГУШЭЎСКІ, загадчыкі сталовых № 1—т. САГАЛОЎ, № 2—т. АКСЭЛЬРОД, № 3—т. ХАЗАН, № 4—ШАМЭС, № 5 — РАГОЗІН, № 10—КРЫВАШЭЕЎ, № 11—Т. АСОБСКАЯ, № 12—т. ШУЛЬЦ, № 13 — т. ФРЫДЛЯНД, № 14 — т. ГУДЗІМАЎ, № 15—КАПЦЭВІЧ, № 16 — ЯДГУР, № 19 — ОЗДЗР, № 21—ФІШКІН, № 23—ВАЙТАСЕВІЧ, № 25 — ГАДМАЕР, № 29 — БЕРШТЭЙН, № 32—ПАЛКОЎ, № 35—МАКСІМЕНКА, № 34—КІВОВІЧ, № 37—КАЗАК, № 40—ХОЦІН, № 41—МАЧАЛЬСКІ, № 43 — БЯСПРЫЗВАНЫ, № 44—ХАРЫТОНЧЫК, № 48—ВОЛЬПЭР, № 49—МЭЛЬЦЭР, № 50—ШАРШУН, № 52—ШАТКОЎСКІ, № 57—НЕКРАШ, загадчыкі ўсіх сталовых ТСТ чыгуначнікаў, прадстаўнікі Белкаапхарчу, харчэшчыкі ТСТ чыгуначнікаў, усіх ЗРК і ЗВК.**

**Калі па якой-небудзь прычыне асобныя загадчыкі зьявіцца ня могуць, абавязкова прысутнасьць іх намесьнікаў.**

**Нарада адбудзецца ў габінэце рэдактара «Зьвязды» (Савецкая 63, 3-ці паверх).**

РЭДАКЦЫЯ «ЗЬВЯЗДЫ».
ЦП САЮЗУ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ.

Рэдакцыя газэты «ЗЬВЯЗДА» сумесна з НАРКАМЗЕМАМ і МЕНСКІМ РАЙКАЛГАССАЮЗАМ сёньня, 21 мая, у 1 гадз. дня склікаюць

## нараду па калгасным гандлі

**На нарадзе будуць абмяркоўвацца практычныя пытаньні арганізацыі калгаснага гандлю ў г. Менску.**

**Яўка абавязкова для старшынь (або іх намесьнікаў) фабзаўкомаў і ЗРК заводаў: «БАЛЬШАВІК», ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, «КАМУНАР» (ЗРК «МЗТАЛІСТ»), «КАСТРЫЧНІК», друкарня імя Сталіна і абутковай фабрыкі.**

**Запрашаюцца прадстаўнікі МЕНКАМГАСУ, ГАРПРАФСАВЕТУ, ГАРСАВЕТУ, БЕЛКААПСАЮЗУ, БЕЛГАНДЛЮ і ГАРСНАБУ.**

**Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэдакцыі «Зьвязды»—Савецкая, 63, 3-ці паверх, пакой прамысловага сэктару.**

Рэдакцыя газэты «ЗЬВЯЗДА».
Наркамзем БССР.
Менрайкалгассаюз.

**23 МАЯ,** у 7 гадз. вечара, у **Доме Камасьвяты** (былы клюб К. Маркса)
**Дзяржарбітражам** пры СНК з удзелам грамадзкасьці
**БУДЗЕ ПРАЦЯГВАЦЦА РАЗГЛЯД СПРЭЧАК**
ПАМІЖ ВЫДАВЕЦТВАМІ **„Зьвязда", „Савецкая Беларусь", ДВБ і Саюздрукам** ПРЫ НК СУВЯЗІ
**аб недахопах у распаўсюджаньні і дастаўцы газэт і часопісяй.**
Запрашаюцца шырокія колы работнікаў сувязі, выдавецтваў, рэдакцый, упаўнаважаныя па друку на прадпрыемствах, кантрольныя пасты, рабкоры і чытачы газэт і часопісяй. **Уваход вольны.**
**Дзяржарбітраж пры СНК.**

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".
ГЭТЫМІ ДНЯМІ
НОВЫ ГУКАВЫ ГІСТАРЫЧНА-МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
**МЁРТВЫ ДОМ**
в жыцьця пісьм. Достаеўскага.
У ГАЛ. РОЛЯХ:
Даставўскі—артыст МХТ. Н. ХМЕЛЁЎ.
Пабеданосцаў — „ „ ПАДГОРНЫ.
Нікалай І — „ „ ВІТАЎТАЎ.
Петрашэўскі — „ „ В. Б. Шкловскі.
Салдат — „ „ Г. КУЗЬНЯЦОЎ.
Рэжысэр В. Федаразў.
Гук. апаратар С. Вахмістраў.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Гукавы мастацкі фільм **ЗЛАТЫЯ ГОРЫ.**
„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Мастацкі фільм **Ордэр на жыцьцё**
ПРАЛЕТАРЫ Мастацкі замежны фільм **ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК.**
„СПАРТАК" Пач. 6-30, 8, 9-30, 11 Каса—ад 5 гадз. З 18 мая новы фільм **Гандляры славай** Доама ў 6 частках.

ЗАГОТСЕНА пры Белканторы „Заготзерно"
прыступіла да складаньня плянаў забесьпячэньня спажыўцоў
**АБ'ЁМФУРАЖОМ (сенам і саломай) на 1932-33 год,**
а таму ўсе прадпрыемствы і ўстановы БССР, якія маюць уласны транспарт, а таксама маюць патрэбнасьць у аб'ёмфуражы для розных мэтаў, павінны прадставіць Белканторы „Заготзерно" абгрунтаваныя гадавыя заяўкі ў раённым і квартальным разрэзе для ўключэньня ў плян забесьпячэньня іх аб'ёмфуражом з 1/VII—32 году па 1/VII—33 году.
**Заяўкі** належыць прадстаўляць па адрасе: Менск, Савецкая 45, Белканторы „Заготзерно" **на пазьней 25 мая г. г.**
Пасьля паказанага тэрміну заяўкі прымацца ня будуць.
**Заготсена пры Белзаготзерне.**

З глыбокім жалем паведамляем родных, сяброў і знаёмых аб нечаканай сьмерці сваёй дачкі
**МАЯЧКІ ГУРСКАЙ,**
якая здарылася 19-V—32 г. у 5 г. 50 м. дня.
Вынасьцела з кватэры (вул. Дрэваапрацоўчыкаў 23 кв. 1,) 21 мая, у 6 гадзін вечара.
Бацькі.

Супрацоўнікі Галоўліту і Галоўкастацтва выказваюць спачуваньне тав. Гурскаму Ільлі Даніловічу з прычыны нечаканай сьмерці яго дачкі
**МАЯЧКІ.**

Адміністрацыя, ячэйка КП(б)Б і мясцком Народнага Камісарыяту Асьветы БССР выказваюць спачуваньне Старшыні Галоўмастацтва тав. Гурскаму І. Д. з прычыны заўчаснай сьмерці яго дачкі
**МАЯЧКІ.**

Беларускае таварыства савецкіх драматургаў, кампазытараў, аўтараў кіно і эстрады выказвае глыбокі жаль і спачуваньне **тав. ГУРСКАМУ Ільлі** з прычыны раптоўнай сьмерці яго адзінае дачкі
**МАЯЧКІ.**

Гарком Пісьменьнікаў глыбока спачувае
**таварышу Ільлі ГУРСКАМУ**
з прычыны нечаканай сьмерці ягонай дачкі
**МАЙІ.**

Калектыў дзяржаўнага юрэйскага вандроўнага тэатру выказвае сваё глыбокае спачуваньне
**тав. ГУРСКАМУ І.**
з прычыны сьмерці яго дачкі
**МАЯЧКІ.**

22 мая г. г., у 7 з пал. гадз. веч., у Доме Пісьменьніка адбудзецца
**пасяджэньне ін-ту літаратуры і мастацтва БАН**
з удзелам пісьменьнікаў, на якім будуць заслуханы наступныя даклады:
„Творчы шлях П. Труса" (праф. Піатуховіч),
„Акадэмічнае выданьне твораў П. Труса" (тав. Мачульскі).
Запрашаюцца пісьменьнікі, удзельнікі рабочых літгурткоў, аспіранты, студэнцтва, выкладчыкі літаратуры і ўсе жадаючыя.

БАБРУЙСКІ ЛЕСАТЭХНАЛЁГІЧНЫ ТЭХНІКУМ
абвяшчае чарговы набор студэнтаў на першы курс аддзяленьняў: фанэрнага, сталярна-будаўнічага і лесапільнага.
Жадаючыя паступіць павінны падаць заявы на імя прыёмнай камісіі тэхнікуму па адрасе: г. Бабруйск, Савецкая, 76, дасатэхнікуму, з дадаткам усіх адпаведных дакумантаў, згодна існуючых правіл прыёму, не пазьней 25 жніўня 1932 г., далучаючы пры гэтым паштовых марак на 30 капеек.
Заняткі пачнуцца 10 верасьня.
Студэнты на 65 проц. ад агульнага ліку забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмерах 45 руб., а не старэйшых да 60 руб., а так сама інтэрнатам.
Дырэктар тэхнікуму Штыцко.

Беларусізму аб'яднаньню брадзільнай прамысловасьці
**патрэбна МАШЫНІСТКА.**
ЗВАРАЧАЦЦА: Рэвалюцыйная, 3, БЕЛБРОДАБ'ЯДНАНЬНЕ.

Пры Магілеўскім Усебеларускім Дзяржаўным Палітасьветтэхнікуме з 1-га ліпеня 1932 г. адкрываюцца
**3-месячныя падрыхтоўчыя курсы**
з разьлікам на 150 чал.
На курсы прымаюцца: рабочыя, калгасьнікі, служачыя, з адукацыяй на базе 7-годкі.
Усе прынятыя курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.
Пры паступленьні неабходна даслаць дакументы: для членаў і кандыдатаў КП(б)Б—камандыроўку ад Райкому КП(б)Б, камсамольцам—ад райкому КСМ, беспартыйным—ад райана, заповненую анкету, дзведку аб сацыяльным становішчы, аб здароўі, аб адукацыі,